№ 6(36)/2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, чэрвень 2001 г.

## НЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ, А НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ І СВАБОДА, БО НЕ БЫВАЕ „ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА” ПАД АКУПАЦЫЯЙ



*Сьцяжок*

## ПЕРШАЕ, ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СПРАВЯДЛІВЫЯ ВЫБАРЫ — ВЫДАЛІЦЬ ЗЬ БЕЛАРУСІ ВІКА

Першая рэальная, але няўдалая, спроба легітымізаваць рэжым Лукашэнкі адбылася ў кастрычніку 2000 г. на выбарах у „палату”. Шлях да гэтай падзеі з боку Масквы і нямецкай дыпляматыі быў доўгі, але мэтанакіраваны. Тут выявілася рэакцыя на дэклярацыю *V-га Зьезду (1997 г.) Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* аб стварэньні *Беларускага Вызвольнага Руху* супраць нэакаляніяльнай палітыкі Расеі ў Беларусі.

У сувязі з лістападаўскім пераваротам ў 1996 годзе, „антылукашэнкаўская апазыцыя” мусіла разваліцца. Яна была часовым супрацоўніцтвам розных антылукашэнкаўскіх сілаў (ад фронтаўцаў да прамаскоўскіх „дэмакратаў” і камуністаў), пагрунтаваным на канкрэтнай мэце — імпічманце Лукашэнкі. Са зьнікненьнем магчымасьці імпічманту разбурыўся грунт для канкрэтнага злучэньня інтарэсаў і апазыцыйнага аб’яднаньня супрацьлеглых поглядаў. Рэальнымі ж засталіся вялікадзяржаўная палітыка Расеі і асноўны каляніяльны канфлікт паміж сіламі расейскага імпэрыялізму і сіламі беларускай незалежнасьці.

Пра гэтае становішча і пэрспэктывы я пісаў у перадзьездаўскім артыкуле „*Вызвольны Рух" (газэта „Свабода", 1997 г.)* і казаў на Зьездзе. Неабходна было скарыстаць сітуацыю ўздыму і арганізаваць яе ў вызвольнае адраджэнцкае рушэньне. Дзеля гэтага былі распачатыя акцыі „***Грамадзянства БНР***", „***Адстаўка***", пазьней — збор подпісаў „***За незалежнасьць***", „***Беларуская Салідарнасьць***" і інш. Справы паварочваліся так, што расейскія каляніяльныя сілы на Беларусі маглі быць проста зьмеценыя з палітычнай сцэны.

Контрадзеяньні супраць беларусаў былі на гэты раз прадуманымі і канцэптуальнымі. Увосень узьнікла закамуфляваная агентурная ініцыятыва — „Хартыя-97", якую рухалі праз журналістаў і дыпляматыю. „Хартыю" плянавалі супроцьставіць *Беларускаму Вызвольнаму Руху* і *Фронту*. Гэтая ідэя не была да канца ажыцьцёўленая (па пэўных прычынах) і пазьней „Хартыя" ператварылася ў асяродак „перавалу" рэсурсаў з Захаду і мэтанакіраванай (выпрацаванай) прапагандысцкай інфармацыі (накіраванай, у істоце сваёй, супраць *Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху*).

У гэты ж час у якасьці кіраўніка Місіі АБСЭ ў Менск прыязджае былы нямецкі амбасадар у Маскве і потым былы кіраўнік зьнешняй разьведкі Нямеччыны **Ганс-Георг Вік**. Вік выступіў ініцыятарам захаваньня старой антылукашэнкаўскай апазыцыі на новай аснове. Ён прапанаваў так званы „перамоўны працэс" з рэжымам улады, ідэю „круглага стала" і ўдзел апазыцыі ў парляманцкіх выбарах на падставе дамоўленасьці (кампрамісу) з Лукашэнкам.

Менавіта Вік спрычыніўся да стварэньня, на падставе гэтых прапановаў, так званай „аб'яднанай апазыцыі" і завёў справу беларускага змаганьня ў сьляпы завулак.

Ганс Вік і іншыя нямецкія „дыпляматы" пераконвалі палітыкаў на Захадзе, што рэжым Лукашэнкі можна „палепшыць", што яго быццам бы можна „дэмакратызаваць". Прызнаньне таго, што рэжым Лукашэнкі „палепшыўся", давала б магчымасьць пэўным заходнім зацікаўленым колам, зьвязаным зь нямецкімі палітычнымі (эканамічнымі, фінансавымі) інтарэсамі, прызнаць гэты рэжым і заплюшчыць вочы на „інтэграцыйную" палітыку Расеі па анэксіі Беларусі.

Нямецкі геапалітычны інтэрас накіраваны, перш за ўсё, на Польшчу. І ў гэтым пляне пэўныя колы нямецкай палітыкі глядзяць на Беларусь як на разьменную манэту ў геапалітычных гешэфтах з Расеяй. Ні для расейскага, ні для нямецкага капіталу (Рургаз з Газпромам і г.д.) непатрэбная незалежная беларуская транзітная тэрыторыя і расходы, зь ёй зьвязаныя. (Ня кажам ужо пра стратэгічныя фактары.) Нямецка-расейскія інтарэсы тут супадаюць, як супадалі сотні гадоў.

Ганс Вік, валодаючы ўплывам на разьмеркаваньне заходніх сродкаў сярод створанай ім „аб'яднанай апазыцыі", мае дачыненьне да спробы разбурэньня *Беларускага Народнага Фронту* — адзінай сілы ў Беларусі, якая здольная супрацьстаяць усёй гэтай нямецка-рускай нэакаляніяльнай палітыцы.

У цэлым, атака на *Фронт* пацярпела фіяска. Але, тым ня менш, прыхільнікам сорасаўскай дэмакратыі ўдалося адкалоць вялікую групу франтаўцаў, якая, таксама пад назвай „БНФ" арганізавана ўвайшла ў сістэму „аб'яднанай апазыцыі".

У кастрычніку 2000 г., у час „выбараў" у „палату", вікаўская палітыка легалізацыі рэжыму набывае рэальныя формы. Меркавалася, вядучы двайную гульню, з аднаго боку, падтрымаць няўдзел апазыцыі у выбарах, з другога — уцягнуць партыі „аб'яднанай апазыцыі" ў выбары, прызнаць іх дэмакратычнымі і легалізаваць „палату".

З гэтага нічога не атрымалася па некалькіх прычынах. Па-першае, Лукашэнка не пайшоў ні на якія, нават мінімальныя, саступкі. Выбары сапраўды былі па-варварску недэмакратычнымі. Па-другое, двурушныя дзеяньні Віка былі дрэнна падрыхтаванымі на беларускім і міжнародным узроўні. Па-трэцяе, „палітыка" Віка на так званых „перамовах" і „выбарах" пастаянна выкрывалася прадстаўнікамі *Народнага Фронту* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, якія запатрабавалі няўдзелу партыяў і насельніцтва ў выбарах і ўклалі потым велізарную працу ў рэалізацыю гэтай справы.

Нямецкія паплечнікі Віка, ня гледзячы на непасрэдны подкуп сябраў партыі „Народная Грамада" і іншых апазыцыйных „дэмакратаў", якім далі грошы за ўдзел у „выбарах" (па пяць тысячаў даляраў на згодніка), нічога ня здолелі перамяніць. Бальшыня беларусаў не галасавала. Выбары праваліліся, але рэжым Лукашэнкі груба сфальсіфікаваў вынікі галасаваньня, і АБСЭ не пайшло на рызыку, каб іх прызнаць. Легалізацыя рэжыму была адкладзеная на выбары прэзыдэнта ў 2001 годзе.

Да гэтага часу Ганс Вік (асабліва пасьля выказваньня ў Беластоку ў верасьні 2000 года пра сваю антыбеларускую палітыку ў рамках АБСЭ) страціў усялякую павагу ў беларусаў. Структуры *Беларускага Вызвольнага Руху* аб'явілі яго **пэрсонай нон-грата** і запатрабавалі ад міжнародных арганізацыяў і МЗС Нямеччыны адкліканьня Віка зь Беларусі.

У абарону Віка парадаксальным чынам заўсёды станавілася ўлада Лукашэнкі, арганізоўваючы паказныя пагрозы і быццам бы атаку на Віка (каб заблытаць грамадзкасьць і заглушыць патрабаваньні *Вызвольнага Руху*). Але рабленьне супольнай прамаскоўскай палітыкі рэжымам Лукашэнкі, Вікам і Масквой — відавочнае.

Эўрапейскія канфармісты ў міжнародных арганізацыях, „усьвядомленыя" за гэты час Вікам, нямецкай і рускай дыпляматыяй, далі выразна зразумець, што прэзыдэнцкія выбары на Беларусі яны схільныя прызнаць пры любых выніках (хіба што парушэньні заканадаўства будуць вельмі скандальнымі). Ведаючы гэта, упэўнена пачуваецца Вік, дэманструе паказную ўпэўненасьць Лукашэнка, спакойна чуецца Масква, як па нотах, гуляюць сваю брыдкаю партыю пяць намэнклятурных кандыдатаў ад вікавай „аб'яднанай апазыцыі" і іншыя падстаўныя фігуры.

Некаторыя „апазыцыянеры-дэмакраты" зразумелі настрой спонсара і аддана працуюць у „патрэбным накірунку".

„Как „лукашисты", так и оппозиционеры, должны четко уяснить, — піша дэмакратычная спадарыня Т.Процька, — допустить нелегитимного, с точки зрения мирового сообщества, президента, нельзя."* *(Народная Воля, — 2001, 20 лютага)*

Камэнтары, як кажуць, непатрэбныя.

Апазыцыянер-дэмакрат Сяргей Калякін выказваецца ў рэчышчы палітыкі Віка зусім адкрыта.

„Они (гэта значыць, заходнія міжнародныя арганізацыі — З.П.) не против сегодня признать Палату представителей. Но они не знают, как это сделать.., идет постепенная смена позиции и, фактически, налаживаются отношения с государственной властью... Западные дипломаты пытаются объяснить власти: мы хотим вас признать, но вы хоть что-то сделайте, чтобы мы могли это сделать." ** *(Белорусский рынок, — 2001, №21)*

Мушу зазначыць, што ўсё выглядае ня гэтак проста. Але такую сітуацыю адносінаў да рэжыму Лукашэнкі вось ужо гадамі стварае Ганс Вік і нямецкая дыпляматыя. Ім прыходзіцца часта выдаваць жаданае за рэальнае. Праўдападобнасьць няпэўнасьці надаюць дэмакратычныя балбатуны.

Тым ня менш, справа сур'ёзная. Устаноўка эўранемцаў зразумелая. Праўда, ня гледзячы на фінансавыя рычагі, наўрад ці здолее Вік і эўрапейскія канфармісты істотна ўплываць на паводзіны кантралёраў і назіральнікаў за галасаваньнем на выбарах. Акрамя таго, *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* і *Народны Фронт* ствараюць сваю сістэму назіральнікаў. Небясьпека, аднак, у тым, што, ня гледзячы на ўсе магчымыя факты парушэньняў выбарчага заканадаўства, прадстаўнікі міжнародных эўрапейскіх арганізацыяў, якіх „праінфармавалі" Ганс Вік і кампанія, могуць праігнараваць парушэньні і прызнаць выбары за законныя і дэмакратычныя.

Каб запабегчы пагаршэньню становішча і ня даць разьвівацца

філісьцерскай авантуры эўраканфармістаў, **неабходна выдаліць зь Беларусі Віка**. Тое, што за гэтую пэрсону нон-грата трымаюцца як пэўныя палітыкі ў эўраструктурах, так і Масква (дзе Вік часта бывае), цяпер надта добра відаць.

Менавіта *Беларускаму Нацыянальна-Вызвольнаму Руху* зноў прыдзецца ўзяць на сябе важную задачу. Патрабаваньне аб адкліканьні Віка зь Беларусі неабходна будзе ўключыць у зьмест выбарчай барацьбы за справядлівыя дэмакратычныя выбары.

Выдаленьне з краіны асобы, якая пад шапкай міжнароднай праваабарончай арганізацыі займаецца дзейнасьцю, што супярэчыць нацыянальным інтарэсам Беларусі і не сумяшчальная з мэтамі гэтай арганізацыі, зьяўляецца неабходным прававым дзеяньнем. Трэба аздаравіць абставіны на выбарах у Беларусі і, нарэшце, спыніць маніпулятараў з Усходу і Захаду, якія, як бачым, даўно аб’ядналіся.

Калі Беларусь страсе з сябе гэтых „дабрадзеяў”, што апанавалі яе, як камары, тады яна пойдзе хутка наперад, да справядлівага парадку, дабрабыту, спакою і сьветлай сваёй нацыянальнай будучыні.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Беларускага***
***Народнага Фронту „Адраджэньне”***

*16 чэрвеня 2001 г.*

---

* „Як „лукашысты”, гэтак і апазыцыянеры, павінны выразна ўсьвядоміць: дапусьціць нелегітымнага, з пункту гледжаньня сусьветнай супольнасьці, прэзыдэнта нельга.” (з рус.)

** „Яны ня супраць сёньня прызнаць Палату прадстаўнікоў. Але яны ня ведаюць, як гэта зрабіць.., адбываецца паступовая зьмена пазыцыі і, фактычна, наладжваюцца адносіны з дзяржаўнай уладай... Заходнія дыпляматы спрабуюць растлумачыць уладзе: мы хочам вас прызнаць, але вы хоць што-небудзь зрабеце, каб мы маглі гэта зрабіць. (з рус.)

# ФІЗІЧНАЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ Н А Ц Ы І

Гісторыя разьвіцьця эўрапейскіх народаў паказвае, што на працягу стагоддзя кожны народ пры больш-менш звычайных (сярэдніх) умовах існаваньня (гэта значыць, улічваючы войны і моры) павялічваў колькасьць свайго насельніцтва ў два разы.

Вучоныя падлічылі, што ў сярэдзіне XVII стагоддзя беларускае насельніцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім складала блізу 3,4 — 3,5 мільёнаў чалавек. На сярэдзіну XVIII-га яно павінна б было павялічыцца да 7 мільёнаў; адпаведна ў сярэдзіне XIX-га — да 14-ці; у сярэдзіне XX-га — да 28-мі , і на пачатак XXI-га стагоддзя мы павінны б налічваць 42 мільёны беларусаў.

Калі дапусьціць магчымасьць нейкіх выключных зьбегаў абставінаў, то беларусаў магло быць цяпер і 50 мільёнаў, і 35 мільёнаў, але ня менш за 30 мільёнаў чалавек. Тым часам нас у Рэспубліцы Беларусь 10 мільёнаў, і гэтая колькасьць не павялічылася на працягу апошніх 50-ці гадоў.

Тэрыторыя цяперашняй Рэспублікі Беларусь амаль у сем разоў большая за плошчу Бэльгіі, але колькасьць насельніцтва аднолькавая, што ў Бэльгіі, што ў Беларусі. Ці, напрыклад, тэрыторыя цяперашняй Беларусі толькі на 19 адсоткаў меншая за плошчу Вялікабрытаніі, але насельніцтва ў 6 разоў меншае. Тэрыторыя Украіны амаль у тры разы большая за плошчу цяперашняй Беларусі, але насельніцтва больш у 5 разоў і г.д.

У сярэднім поясе Эўропы такога анамальнага стану, як у Беларусі, не назіраецца ні ў адной краіне.

Трэба, праўда, улічыць, што ў сярэдзіне XVII стагоддзя у Вялікім Княстве знаходзіліся ўсе беларускія этнічныя землі: і Смаленшчына, і Дзьвіншчына, і Севершчына, і Віленшчына, і Падляшша. Тэрыторыя Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 г. разам з гэтымі землямі дасягала блізу 400 тысячаў квадратных кілёмэтраў. Гэта значна больш, чым плошча такіх цяперашніх краінаў, як Італія, Польшча, Вялікабрытанія. Розныя дасьледчыкі і палітыкі (прымаючы пад увагу ваенны час, уцекачоў, вымушаную міграцыю) налічвалі на тэрыторыі *БНР* ад 14 да 17 мільёнаў жыхароў. Цяпер, праз 80 гадоў, на гэтай тэрыторыі таксама пражывае каля 14,5 мільёна людзей. Колькасьць аўтахтонных беларусаў за межамі Рэспублікі Беларусь за гэты час зьменшылася. Балянс павелічэньня беларускага насельніцтва практычна ўсюды аднолькавы — мінусовы.

За 70 гадоў знаходжаньня ў складзе савецкай Расеі Смаленскі край быў вынішчаны дазваньня і стаў падобным на астатнюю Расею. Вобласьць абязьлюдзела. Насельніцтва ў некаторых раёнах Смаленшчыны зьменшылася ў 10 разоў, урадлівыя землі пазарасталі хмызьняком і мохам.

Цяпер на Смаленшчыне, як і раней, няма ніводнай беларускай школы, ніводнай беларускай газэты ці часопіса, ні беларускага радыё, ні тэлебачаньня. Задушана ўсё.

Беларуская мова ў асноўным засталася ў смаленскіх вёсках ды ў фальклёры.

У Смаленшчыне заўсёды быў даволі высокі ўзровень беларускай сьведамасьці. Бальшавікі, супрацьпастаўляючыся *БНР*, нават БССР аб’яўлялі ў Смаленску. У 1930-х гадах урадам савецкай Беларусі былі падрыхтаваныя неабходныя дакументы па вяртаньні Смаленшчыны ў склад БССР. Аднак новая хваля сталінскіх рэпрэсіяў утапіла ў крыві ўсе гэтыя намеры.

* * *

Што ж гэта такое адбываецца з нашым народам і нашай супольнасьцю на працягу вось ужо больш чым 300 апошніх гадоў! Чаму такая вялікая гістарычная культура на ўсходзе Эўропы, як беларуская, занепадае, а насельніцтва зьмяншаецца? Чаму беларусы практычна выпалі з гістарычнага парадку дэмаграфічнага разьвіцьця?

18 сакавіка сёлета доктар Вітаўт Кіпель прачытаў у Нью-Ёрку рэфэрат з нагоды 83-й гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі. Ён выказаў дакладную, на мой погляд, думку аб тым, што галоўнай палітычнай звышзадачай пэрманэнтнай расейскай агрэсіі на Беларусь было не настолькі зьнішчэньне беларускай дзяржаўнасьці на заходняй мяжы Расеі, колькі ўвогуле фізічнае вынішчэньне беларускай нацыі. І пачалося ўсё мэтадычна, як лічыць В. Кіпель, менавіта з сярэдзіны XVII стагоддзя, ад часу, калі стала ўжо складвацца расейская імпэрыя. (Расея аб’явіла сябе імпэрыяй у 1721 г.)

Такой самай думкі прытрымліваліся некалі гісторыкі Міхась Ткачоў і Мікола Ермаловіч. Вывучэньнем гэтага пытаньня на раньнім этапе (XVII-е стагоддзе) займаецца гісторык Генадзь Сагановіч і іншыя дасьледчыкі.

* * *

У сярэдзіне XVII стагоддзя была страшная вайна паміж Расеяй і Вялікім Княствам, якая доўжылася з 1654 па 1667 год і закончылася перамогай беларусаў, але вынікі яе для нашай краіны, нягледзячы на перамогу, былі жахлівымі. Па-першае, расейцы на нашу зямлю напалі і вайна доўгія гады адбывалася на нашай тэрыторыі. Але нават ня ў гэтым сутнасьць. Расейцы, заняўшы беларускую тэрыторыю, ужывалі тактыку генацыду — татальнага вынішчэньня цывільнага насельніцтва. Палітыка выпаленай зямлі на часова акупаваных беларускіх землях была сплянаваная рускім царом Аляксеем Міхайлавічам і яго ваяводамі і праводзілася масава, мэтадычна і пасьлядоўна. Маскоўцы стварылі спэцыяльныя атрады, задача якіх заключалася ў тым, каб спальваць беларускія паселішчы і забіваць усіх людзей, вынішчаць усё жывое. Маскавіты арганізавалі прадуманае і пастаяннае людабойства на захопленых землях Беларусі і займаліся гэтым увесь час, пакуль, нарэшце, іх ня выгналі.

У выніку генацыду і ваенных дзеяньняў Беларусь, па падліках вучоных, страціла ад 51 да 53 адсоткаў насельніцтва. Маскоўцы забілі больш за 1 мільён 800 тысячаў цывільных беларусаў. Усходнія

беларускія землі: Смаленшчына, Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына — абязьлюдзелі. Там засталося жывых толькі 30 адсоткаў людзей.

З таго часу і да сёньняшняга дня не было больш страшнай народнай катастрофы, чым чалавечая катастрофа Беларусі ў сярэдзіне XVII стагоддзя. Ні генацыд армянаў, ні галакост габрэяў немагчыма нават параўноўваць з тым, што адбывалася ў Беларусі тры з паловай стагоддзі таму.

Вобразна кажучы, з таго часу наш народ нібы падрэзалі. Было амаль поўнасьцю пазабіванае насельніцтва беларускіх гарадоў. (Ад 70 да 95 адсоткаў людзей загінула ў кожным горадзе.) Парушылася сацыяльная структура грамадзтва, зьніклі цэлыя пласты насельніцтва. Беларусь страціла бальшыню сваіх мяшчанаў, купцоў, рамесьнікаў, эліту гаспадарства. Апусьцелыя землі пазарасталі кустоўем, травой. Беларуская дзяржава і грамадзтва ўжо не змаглі падняцца, хутка аднавіць насельніцтва, маёмасьць, нерухомасьць, рамесную вытворчасьць, багацьце зямлі і людзей.

Як археоляг я займаўся позьнім сярэднявеччам, якраз пэрыядам з XIV да XIX стагоддзя. Нас, дасьледчыкаў, усіх уражвала тая акалічнасьць, як выразна наша зямля адлюстравала катастрофу. Культурныя пласты XVI-XVII стагоддзяў найбольш багатыя і найбольш насычаныя вельмі разнастайным рэчавым матэрыялам высокага ўзроўню. Але вось пайшоў пласт XVIII стагоддзя. Відовішча ўражвае. Ён надзвычай бедны знаходкамі і пусты, намэнклятура і ўзровень знаходак абмежаваныя. І так па ўсёй Беларусі. Зямля зафіксавала катастрофу і рэгрэс матэрыяльнай культуры, заняпад гандлю, рамёстваў, узроўню жыцьця, зьмяншэньне колькасьці насельніцтва і зьбядненьне людзей.

У той жа час Расея, пры дапамозе немцаў, ператварылася ў імпэрыю і ўвесь час нарошчвала агрэсію. Зацяжная Паўночная вайна яшчэ больш пагоршыла становішча. Цяпер генацыд беларускага насельніцтва прадаўжаў шалёны рускі цар Пётра І. Наступная руская царыца немка Кацярына дамагляся ў канцы XVIII стагоддзя ліквідацыі беларускай дзяржавы і анэксіі Беларусі.

З гэтага часу, згодна расейскіх плянаў, гісторыя для беларусаў павінна была скончыцца, а народ — не існаваць. Быў зачынены ўнівэрсітэт у Вільні, ліквідаваныя базылянскія манастыры і школы, зьнішчана беларуская адукацыя і кнігадрук, ліквідаваная грэка-каталіцкая вера, забітыя і замучаныя тысячы вуніятаў, манахаў і сьвятароў, спаленыя беларускія кнігі, іконы і абразы. Потым — забароненая беларуская мова і назва Беларусь.

Адразу, ужо з канца XVIII стагоддзя, пачалі зьнішчаць беларускую архітэктуру ў гарадах і перарабляць гістарычную пляніроўку беларускіх гарадоў. Потым стварылі спэцыяльны „будаўнічы дэпартамант", які займаўся разбурэньнем і перабудовай беларускіх цэркваў пад кананізаваны „рускі стыль".

Па маіх падліках, да канца XIX стагоддзя гэты дэпартамант разбурыў і часткова перабудаваў пад рускую моду каля 2000 беларускіх храмаў.

Гэтак жа прадумана вынішчалі здольных людзей, асабліва адукаваную моладзь і шляхту, якую душылі пад відам змаганьня з крамолай. Пэрспэктыўных асобаў з сялянства звычайна забіралі ў рускае войска на 25 гадоў. У рускай вайсковай душагубцы зьніклі тысячы беларускіх талентаў і змагароў. Найбольш вядомая трагічная гісторыя з паэтам Паўлюком Багрымам, якога згнаілі ў расейскім войску, а рукапісы вершаў зьнішчылі. Застаўся адзін толькі выдатны верш, які, дарэчы, забясьпечыў Багрыму месца ў беларускай літаратуры.

* * *

У другой палове XIX стагоддзя рускія палітыкі, вучоныя ды пісьменьнікі істотна ўдакладнілі канцэпцыю вынішчэньня беларусаў. Галоўным яе зьвяном стала татальная русіфікацыя. „Руская школа зробіць больш, чым рускі штык", — казалі яе прапагандысты (тыпу Карнілава). „Главное в русификации края — это чтобы научить белорусских мальчиков петь русские песни", — пісаў у 1896 годзе ў „Биржевых ведомостях" нейкі адданы рускі патрыёт.

Усё, што не памяшчалася ў рамкі русіфікацыі і выходзіла за гэтыя рамкі, перасьледвалася, найбольш здольных — зьнішчалі.

Уражваюць катаваньні паэта Адама Гурыновіча за беларускія вершы. Засталіся нават астрожныя фатаграфіі, дзе яго, зьбітага, сфатаграфавалі як злачынцу.

Пачатак XX-га стагоддзя. Карусь Каганец, Алесь Гарун, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Якуб Колас, Алесь Бурбіс, дзясяткі лепшых — турма і катарга. Пасьля рускай турмы выжыў толькі Якуб Колас. Усе астатнія неўзабаве памерлі ад сухотаў.

1-я Сусьветная вайна. Беларусь страціла каля паўтара мільёна людзей. Вайна вялася не на рускай, а на беларускай тэрыторыі. Пры адступленьні рускія войскі ў абавязковым парадку спальвалі ўсё, што магло б дастацца немцам: збожжа на корані, усе харчовыя запасы, масты, забівалі жывёлу і г.д. Пачаўся голад. Для бальшыні беларускага насельніцтва была аб'яўлена абавязковая эвакуацыя. Шмат інтэлігентных беларусаў схапілі ў рускае войска, адкуль яны ўжо ў большасьці не вярнуліся.

А потым пачаўся бальшавізм, калектывізацыя, сталінізм, Курапаты, брэжнеўшчына ды псіхушкі. Вынік — каля 3-х мільёнаў забітых беларусаў, і сярод іх лепшыя, найбольш адукаваныя, актыўныя таленавітыя і працавітыя людзі нацыі.

* * *

Тое, што зьнішчэньне Беларусі ўвесь час, пачынаючы з XVII стагоддзя, было галоўным рускім геапалітычным інтарэсам на захадзе, расейцы, фактычна, і не хавалі. (Ельцынская вялікадзяржаўная дактрына аднаўленьня расейскай імпэрыі, складзеная ў 1995 г., таксама пра гэта сьведчаць.)

У рускай заходняй палітыцы ўвесь час існуе ўнутраная ўстаноўка на фізічнае вынішчэньне беларускай нацыі. Становішча, якое склалася, патрабуе спэцыяльнага аналізу, каб выразна высьветліць гэтае ***калектыўнае злачынства цэлых пакаленьняў рускіх палітыкаў, учыненае над беларусамі***. Ненавісныя адносіны да нас, беларусаў, з боку расейскай дзяржавы, асабліва добра відаць, калі нішчыцелі адыходзяць ад прынцыпу выбранасьці і пачынаюць масавае забойства простых людзей — цывільных беларусаў, гэтак жа, як у сярэдзіне XVII стагоддзя.

Звычайна ў такіх выпадках выкарыстоўваецца вайна, альбо нейкія надзвычайныя абставіны, якія часам штучна ствараюцца (як у 30-х гадах). Чым, напрыклад, можна растлумачыць той факт, што калі ў 1944 годзе (пасьля заняцьця Беларусі савецкімі войскамі) моц беларускіх хлопцаў мабілізавалі ў савецкую армію і амаль без абучэньня адразу накіравалі на перадавую? Іх гналі бяз зброі ў непатрэбныя атакі пад нямецкія кулямёты. Альбо зь вінтоўкамі, ды без патронаў. А калі тыя, што выжывалі пад нямецкімі кулямі, уцякалі назад — іх сустракаў кулямётны агонь энкавэдзісцкіх „заградотрядов". Я ўжо не кажу, што „заградотряды" стралялі таксама і ў плечы.

Так былі расстраляныя тысячы беларусаў. Рускія выкарыстоўвалі вайну, і нават франтавыя баі, з мэтай генацыду беларускай нацыі. Не па немцах ім абходзіла ў першую чаргу страляць, а разам зь немцамі — па беларусах. І не прыдзярэшся: маўляў, загінулі ў баі зь нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Я ўжо ня буду тут гаварыць пра так званых „савецкіх партызанаў" і іхныя дачыненьні да беларусаў у час вайны. Гэта асобная размова. Вядома, як у асяроддзі самых партызанаў энкавэдзісты вынішчалі беларускіх камандзіраў, як правакавалі нямецкія спаленьні беларускіх вёсак, як рабавалі і мардавалі беларускае насельніцтва.



*Першая Сусьветная вайна. Расейцы, адступаючы, паляць беларускую вёску.*

* * *

Вернемся ў 30-я гады. Я ўжо не аднойчы пісаў раней, што сталінскі генацыд на Беларусі меў асаблівы характар. Беларускае насельніцтва вынішчалі плянава. Усім савецкім адміністрацыйным і партыйным кіраўнікам спускалі разнарадку на квартал выявіць адпаведную колькасьць „ворагаў народу". Разнарадка спускалася на кожную беларускую вёску і на кожнае прадпрыемства. Кожнае міністэрства мела свой аддзел па ГУЛАГу.

Разнарадкі выконваліся. Кожную ноч каціліся па беларускіх вуліцах і вёсках чорныя энкавэдзісцкія буды-крумкачы і загружаліся ахвярамі.

У памежжы з польскай акупацыйнай зонай савецкім памежнікам давалі вінтоўку і рыдлёўку. Калі такі памежнік сустракаў у бязьлюдным месцы беларуса ці беларуску, ён павінен быў чалавека застрэліць і сам рыдлёўкай закапаць труп. Сяляне вельмі баяліся, каб не спаткаць ваеннага з рыдлёўкай. (Усё гэта ўжо было надрукавана ў беларускім друку ў 90-х гадах мінулага стагоддзя, але неяк нібы і не ўскалыхнула цяперашніх людзей.)

Сітуацыя з памежнай зонай і нават кампанія з „ворагамі народа" падаваліся нібы працяг становішча вайны і выкарыстоўваліся як маніпуляцыі для зьнішчэньня людзей.

Але зьмест камуністычнага генацыду ня толькі ў яго заплянаванасьці. Вынішчаліся, перш за ўсё, разумныя, працавітыя, адукаваныя, прыстойныя, паважаныя, актыўныя, здаровыя, таленавітыя людзі, эліта народу, інтэлект нацыі. Так былі амаль поўнасьцю зьнішчаныя беларускія вучоныя і пісьменьнікі, палітыкі і грамадзкія дзеячы, мастакі і настаўнікі, адміністратары і гаспадары, нават камуністычны беларускі партыйны апарат.

Гэтая палітыка тлела пасьля вайны. Пазачынялі беларускія школы. Выхаласьцілі літаратуру і мастацтва. Выгналі беларускую мову з афіцыйнага ўжытку. Над скошаным пакаленьнем легіёны наглядчыкаў сачылі, каб нічога не паднялося, каб нічога ня вырасла беларускага.

У 1986 годзе выбухнула Чарнобыльская катастрофа.

* * *

Мы бачым, як беларуская трагедыя Чарнобыля знарок расцягваецца ў часе — гэта ёсьць выкарыстаньне ўмоваў экалягічнай катастрофы дзеля генацыду беларускага насельніцтва.

Беларусы змагаюцца на ўсіх узроўнях, але зададзенасьць вынішчальнай тэндэнцыі з боку рэжыму Лукашэнкі відавочная.

*„Ідзе вялікая Чарнобыльская вайна*, — піша Уладзімер Старчанка. ***— Для беларусаў чарнобыльская навала па сваіх дэмаграфічных наступствах значна пераўзыходзіць Другую Сусьветную вайну**, калі загінуў кожны трэці беларус. Але яшчэ страшней тое, што мы ня ведаем, на колькі большую за вайну шкоду гэтая катастрофа нам прынясе ў пэрспэктыве." („Ніва", — 2001, 29 красавіка)*

Страшны „ёдны ўдар" у першы тыдзень пасьля аварыі, які накрыў мільёны беларусаў, поўнасьцю справакавала Масква і яе камуністычная каляніяльная адміністрацыя ў Беларусі. У выніку засакрэчаньня катастрофы і маштабаў яе радыяцыйнай небясьпекі, беларуская нацыя атрымала велізарную калектыўную дозу радыяцыйнага абпраменьваньня.

У 1986-87 гг. камуністычна-дзяржаўнай медыцынай, па падказцы зьверху, было вынішчана, шляхам забіцьця плоду, цэлае пакаленьне беларусаў. (Прымушалі жанчын рабіць аборты ў сувязі з чарнобыльскай пагрозай.) Гэта было абсалютна неапраўдана ні зь медыцынскага, ні з маральнага, ні зь якога іншага гледзішча. Потым, прадаўжаючы медыцынскі генацыд, распрацавалі злавесную палітыку па спыненьні нараджальнасьці беларусаў і забіцьцю чалавечага зародка ва ўлоньні жанчыны.

*„Сёньня з кожных трох зачатых беларусаў*, — піша Ўладзімер Старчанка, — *двух забіваюць у жываце маці! Фактычна, некалькі пакаленьняў беларусаў у літаральным сэнсе былі спушчаныя ў бальнічны ўнітаз. Гэта нябачны ў сьвеце і ганебны факт... Гітлеру такое і ня сьнілася."*

І сапраўды, ня сьнілася. У Беларусі, дзе зьмяншаецца насельніцтва, практыкуюць стэрэлізацыю жанчынаў. Жанчыны горада Барысава засьведчылі, што ім, адразу ж пасьля народзінаў дзяцей, лекары жаночай кансультацыі ***ўльтыматыўна*** прапаноўвалі ў якасьці кантрацэптываў карыстаць так званую „унутрыматачную сьпіраль" або іншыя сродкі прадухіленьня цяжарнасьці. Калі ж парадзіхі адмаўляліся гэта рабіць, ім „мэдыкі" не выдавалі дакументы дзеля атрыманьня належнай у такіх выпадках грашовай дапамогі на немаўлят.

Барысаўчанка ***Ірына Сільніцкая*** (маці двух дзяцей, меншаму — 9 месяцаў) сьведчыць: *„Сказалі: пакуль не паставіш сьпіраль, ніякай дапамогі табе ня будзе. Дапамогі я так і не атрымала, бо сьпіраль я ставіць не захацела... Грошай катастрафічна не хапае". („Беларускія Ведамасьці", — 2000, №4(27), с.13)*

Аналягічныя гісторыі распавялі барысаўчанкі ***Галіна Раскоша***, ***Алеся Ясюк***, ***Ларыса Грэбнева*** ды іншыя.

У жаночай кансультацыі горада Барысава загадчыца гінекалягічнага аддзяленьня Тамара Барысавец патлумачыла, што такі „парадак" вызначае пастанова Саўміна БССР, прынятая летам 1991 г. Загадчыца паведаміла таксама, што іхняя „кансультацыя" праводзіць ***стэрэлізацыю шматдзетных маці***, каб пазьбегнуць, маўляў, нараджэньня хворых дзяцей і росту „асацыяльных" сем'яў. *(„Беларускія Ведамасьці", — 2000, №4(27), с.13)*

15-га чэрвеня мінулага году супраць гінекалягічнага генацыду



***Радыяцыйная зона на Гомельшчыне. Тут жылі беларусы.***

адкрыта выступілі барысаўскія жанчыны і мужчыны. Група асобаў арганізавала пікет. Усіх арыштавалі і судзілі.

У выніку масавага забойства зародкаў людзей, а таксама з прычыны хваробаў, выкліканых радыяцыяй, беларуская нацыя раптам пачала хутка выміраць. Вымірае ўжо ў сярэднім сто тысячаў беларусаў у год. ***Калі беларуская супольнасьць ня здолее пазбавіцца ад агрэсіі расейскага каляніялізму і ня выправіць становішча з Чарнобылем, то ў XXI стагоддзі не застанецца ніводнага беларуса. Увесь народ вымардуюць і вымараць у пень, да апошняга чалавека***.

Я ўжо пісаў ня раз пра тое, як вынішчыўшы беларускую нацыянальную эліту і абапіраючыся на прамаскоўскую каляніяльную адміністрацыю ў Беларусі, расейскае КГБ у сярэдзіне 90-х гадоў палітычным мэтадам ажыцьцявіла захоп беларускай улады знутры. Адбылася ўнутраная акупацыя. Зараз падрыхтоўваецца захоп нацыянальнай маёмасьці Беларусі пад выглядам прыватызацыі і адначасна ажыцьцяўляецца акупацыя беларускай тэрыторыі.

Тыя забруджаныя радыёактыўнымі рэчывамі землі на Гомельшчыне і Магілёўшчыне, зь якіх прымусова выселілі беларусаў, цяпер інтэнсіўна засяляюць крымінальнікамі, наркаманамі, „бамжамі", рускімі адкідамі грамадзтва з Расеі, Сібіры, краінаў Сярэдняй Азіі і Каўказу. Гэтыя адлучаныя ад нашых людзей тэрыторыі ўжо не пустуюць. Там ствараецца руская крымінальная зона з сваім самакіраваньнем, непісанымі законамі і фінансамі (ад пеpавалу наркотыкаў). Каляніяльныя ўлады Беларусі даюць ім від на жыхарства, і нават грамадзянства. Так адбываецца калянізацыя беларускай чарнобыльскай тэрыторыі Расеяй.

Гэта тыповая і гістарычная расейская палітыка. На замацаваньне здабытых тэрыторыяў кідалі (высялялі, выганялі, заахвочвалі) крымінальнікаў, бандытаў, тацяў, авантурыстаў ды валацуг. Імі, перш за ўсё, засяляліся падбітыя землі каля Каўказу, на Поўдні ды ў Сібіры, зь іх фармаваліся банды Ермака ды Сьценькі Разіна, ды „вольнае казацтва". Гэтак аднаўлялася новая імпэрыя Чынгіз-Хана.

Тое самае робіцца цяпер у сучасным варыяньце. Расея, за кошт чарнобыльскай Беларусі, вырашае свае праблемы перанасычанасьці крымінальнікамі, уцекачамі зь мясьцінаў, дзе яна вядзе брудныя войны, бамжамі, апушчанымі людзьмі, абрабаванымі рускім крымінальным „капіталізмам". Расея ськідвае іх у чарнобыльскую Беларусь і адначасна займае расчышчаную ад беларусаў тэрыторыю. Пры патрэбе, там апынецца і зброя, і неабходныя людзі, і падымецца прапагандысцкі лямант („рускіх абіжают").

Акупацыя беларускай зямлі расейскай крымінальшчынай адбываецца на вачах тысячаў беларусаў, сагнаных з радзімы. Гэта ў іхных, ужо зарослых быльлём, родных хатах бадзяжны паселены гун...

Ці разумее хоць беларуская інтэлектуальная маса, ці разумеюць вярхі грамадзтва сэнс гісторыі, што рухаецца перад імі?.. Ці хочуць яны жыць, ці жадаюць яны шчасьця дзецям?

Старчанка разумее. Ён піша: *„Фактычна на працягу 15 постчарнобыльскіх гадоў супраць беларусаў каляніяльнымі ўладамі вядзецца неабвешчаная прыхаваная вайна, мэта якой —* ***зьнішчэньне беларускага народа, вызваленьне жыцьцёвай прасторы і засяленьне яе прышлымі элемэнтамі****. Дзеля гэтага не выкарыстоўваюцца, як у ранейшыя часы, самалёты, танкі, агнястрэльная зброя, газавыя камэры і не будуюцца „асьвенцымы". Хаця і пачалася яна ўвесну 1986 года якраз з таго, што савецкія ваенныя самалёты асаджалі радыяцыйныя аблокі на Гомельшчыну і Магілёўшчыну.*

*У век інфармацыйных і палітычных тэхналёгіяў у гэтым няма патрэбы. Асабліва, калі гаворка ідзе пра зьнішчэньне зрусіфікаванага за 200 гадоў каляніяльнага існаваньня „братняга" беларускага народу, якому нож пад сэрца можна засунуць, гледзячы проста ў вочы і гаворачы пяшчотныя словы пра вечную любоў і інтэграцыю. Нашыя даверлівыя людзі ўсяроўна пярэчыць ня будуць." („Ніва",— 2001, 29 красавіка)*

Аўтар прыходзіць да высновы, што трэба ***„паўстаць на абарону сваіх дзяцей, бо іншага ня дадзена!"***.

* * *

Чарнобыль — гэта бясспрэчны факт злачынства, учынены над беларускай нацыяй. Злачынства ад самага пачатку цынічна разыгрывалася на нашых вачах.

Па сваіх наступствах, якія ўжо ёсьць, і асабліва якія яшчэ наступяць, чарнобыльскі генацыд можна параўнаць толькі з людабойствам сярэдзіны XVII стагоддзя, з калектывізацыяй і бальшавіцкім тэрорам 30-х гадоў. Чарнобыль страшны тым, што наступствы яго

разьвіваюцца на працягу пакаленьняў, разбуральна дзейнічаюць і нарастаюць, як лавіна ў гарах. 50 мільёнаў кюры, што адпавядае 500-м атамным хірасімскім бомбам, абрынулі на наш народ у 1986 годзе. Гэты ўсяленскі выбух, запаволены ў часе, — прадаўжаецца.

Адносіны цяперашняга рэжыму да чарнобыльскага пытаньня дакладна ўкладваюцца ў рамкі канцэпцыі вынішчэньня беларусаў з выкарыстаньнем сітуацыі. (У дадзеным выпадку — ядзернай катастрофы.)

У прынцыпе, па маіх назіраньнях, рэжым Лукашэнкі ў цэлым падрыхтаваны да правядзеньня масавых рэпрэсіяў беларускай эліты. Рабіць гэта будуць, вядома, не беларусы, а хутчэй за ўсё, рускія часткі „спэцназу". Сістэма ўжо створаная і доступ расейскіх ваенных у беларускія ўнутраныя войскі адчынены. Практычныя навыкі адпрацоўваюцца на чачэнцах у Ічкерыі.

Пакуль што ў Беларусі зьнішчаюць толькі актыўных людзей, якія, на думку тых, хто гэтым кіруе, могуць нейкім чынам паграsevere уладзе. Пры стварэньні адпаведных умоваў, якімі зьяўляюцца перш за ўсё анэксія Беларусі, уключэньне яе ў склад Расеі і ліквідацыя дзяржаўнасьці, махавік бандыцкай палітычнай машыны сучаснага рускага кагэбізму запрацуе на ўсю моц. У гэтым можна не сумнявацца. Беларуская нацыя тады будзе фізічна вынішчаная. Мы бачым, што яны робяць ў Чачэніі. Арсэналу прыёмаў у расейцаў хапае.

* * *

Раздумляючы над сказаным, зноў і зноў вяртаюся ва ўяўленьнях у XVII-е стагоддзе, бо адтуль усё пачалося. Надлом здарыўся менавіта тады, калі раптоўна, за кароткі час, Беларусь страціла больш за палову сваіх жыхароў і апусьцела зямля.

Калі разглядаць народ як адзіны арганізм, то магчыма, што для кожнай супольнасьці ёсьць нейкая парогавая мяжа людзкіх стратаў, перакрочыўшы якую, народ ужо ня можа ўзьняцца і нібы застывае ў разьвіцьці ў вечным цярпеньні і змаганьні самога з сабой. Непрыяцелям застаецца толькі мэтадычна зьнішчаць эліту паралізаванага грамадзтва і валодаць яго душой.

Уражвае, што вялікі народ вялікай краіны, якая распрасьціралася ад мора да мора, стаў аб'ектам генацыду; выйграў вайну, але страціў насельніцтва і ўпаў.

І не даюць падняцца гэтаму народу. Як толькі ён выкарабкваецца, каб стаць на ногі, яго тут жа зноў сьпіхваюць у яму.

Беларускі сьвет так і не знайшоў спосабу эфэктыўнай барацьбы з варварствам. А гэта мусіў бы быць актыўны спосаб. Бо ***нельга ваяваць толькі на сваёй тэрыторыі***.

* * *

Які выхад, як збавіцца ад вынішчэньня? Выснова відавочная. Цяперашняе пакаленьне беларусаў, і асабліва тое, якое ўступае зараз у актыўнае жыцьцё, ***павінны перагледзець дачыненьні з Расеяй*** і тыя адносіны да яе, якія былі накінутыя нам за часы акупацыі і савецкага каланіялізму. Расею нельга дапускаць у беларускую палітыку. Нельга мець ніякіх агульных справаў з Расеяй, ніякіх саюзаў і карпарацыяў ды сумесных прадпрыемстваў. Трэба захоўваць зь ёй мірныя дачыненьні праз добрую мяжу. Неабходна будзе, магчыма, на даўжэйшы час, абмежаваць да мінімуму (5-7 адсоткаў) гандаль з Расеяй, каб аберагчы беларускую палітыку, эканоміку і фінансавую сістэму ад расейскіх разбуральных уплываў, дэфолтаў, інфляцыі, палітычных і эканамічных авантураў.

Неабходна спыніць штучна створаную і нявыгадную нам энэргетычную прывязанасьць да рэсурсаў Расеі; ліквідаваць наступ рускай маскультуры і сістэму дэзінфармацыі ў электронным інфармацыйным полі Беларусі. Трэба паставіць заслон палітычнай агрэсіі з боку Расеі на Беларусь.

Цяперашнія беларусы мусяць, нарэшце, зразумець: ніколі ў гісторыі Расея не была нашым сябрам і прыхільнікам, ня ёсьць цяпер і ніколі ня будзе ў будучыні, пакуль застанецца імпэрыяй. Спрачацца можна з сябрамі. Зь непрыяцелямі трэба трымацца на адлегласьці і захоўваць карэктныя дачыненьні. Гэта называецца — мірнае суіснаваньне.



***Гомельшчына. Ціхі Чарнобыльскі генацыд.*** *(Фота А.Кляшчука. 1995г.)*

***Усялякае збліжэньне з Расеяй было і будзе небясьпечным і разбуральным для беларусаў. Бо варожасьць з боку Расеі і расейцаў да беларускай дзяржаўнасьці, свабоды і незалежнасьці — пэрманэнтная.*** Цяперашняя руская палітыка зноў, і як заўсёды, гэта наглядна пацьвярджае.

Ня гледзячы ні на якія перамены ўлады ў Крамлі, Расея застанецца ўвесь час агрэсіўнай у дачыненьні да Беларусі і іншых краінаў да таго часу, ***пакуль яна будзе існаваць як імпэрыя*** і захоўваць канглямэрат каланіяльных народаў. Рускія ня могуць стаць свабодным народам, уціскаючы і душачы іншыя народы і кажучы (як у Чачэніі), што ўсюды „іхняя зямля". Брудная вайна і людабойства, якое праводзіць Расея ў Ічкерыі, выклікае агіду да рускай палітыкі.

Маючы суседам агрэсіўную імпэрыю на ўсходзе, цяперашнія і будучыя беларускія палітычныя дзеячы мусяць будуць заўсёды праводзіць актыўную міжнародную дзейнасьць, калі ўсьвядомяць толькі, пры якіх умовах можа бясьпечна існаваць Беларусь. *Карфаген павінен быць разбураны*. Павінны быць спыненыя гэты вечны агрэсіўны паход на Захад і зьнішчэньне Беларусі, што доўжацца стагоддзямі.

* * *

Дзеля таго, каб выжыць і зьберагчы нацыю, беларусам неабходна першачаргова вырашыць дзьве задачы: ***канчаткова збавіцца ад расейскага каланіялізму і ліквідаваць наступствы Чарнобылю***. Адно з другім спалучанае. Без спыненьня каланіяльнай палітыкі Расеі ў Беларусі, без умацаваньня незалежнай Беларускай дзяржавы,



*Курапаты. Беларусы перад памяцьцю пра генацыд.* (Фота Ю. Дзядзінкіна)

беларускага права і свабоды, пазьбегнуць вынішчэньня і ліквідаваць Чарнобыльскую вайну немагчыма.

У 1988 годзе, зыходзячы зь неабходнасьці вырашэньня гэтых дзьвюх галоўных задачаў, паўстаў, аб'яднаны нацыянальнай ідэяй, *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”.*

Тое, што ўдалося падняць *Фронту*, выклікае павагу і зьдзіўленьне у тых, хто разумее маштабы вынішчэньня нацыі. Але спыніць расейскую каляніяльную агрэсію і перамагчы ў Чарнобыльскай вайне, калі змагаецца толькі актыўная частка змагароў, — цяжка. Гэта задача ўсяго беларускага грамадзтва.

*18 сакавіка - 29 красавіка 2001г.* **Зянон ПАЗЬНЯК**
*Нью-Ёрк, Варшава*

# ВЕРШ ГЕНІЯ

У часіны, калі аднадумцы зьбіраюцца разам і іншыя, гатовыя іх пачуць, трэба, як я лічу, заўсёды і абавязкова паўтараць і ўспамінаць словы Вялікіх беларусаў пра Вялікую Беларускую Мову. Бо няма нічога вышэйшага для нацыі, чым яе мова. Гэта каштоўнасьць „нумар адзін”, угрунтаваная натуральным правам.

Пра мову народа гэтак жа, як і пра каштоўнасьць жыцьця, не дыскутуюць, бо іхняя існасьць і патрэбнасьць неаспрэчныя і несумненныя. Іх шануюць.

Шмат хто на сьвеце гаварыў пра сваю мову: філёсафы і паэты, навукоўцы і мысьляры. Але ніводзін філёсаф і ніводзін паэт ня выказаўся глыбей, чым наш вялікі ***БАГУШЭВІЧ***: ***„Шануйце мову нашу беларускую, каб ня ўмёрлі”.***

Услухаемся і задумаемся. Гэтыя словы ёсьць наймудрэйшы, найкарацейшы і найпрыгажэйшы верш генія. Ніхто на сьвеце пра мову не напісаў лепш.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *САКАВІК* *(працяг)*

*10 сакавіка, Ворша.* Актывісты *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* правялі пікет у цэнтры Воршы. Пікет быў прысьвечаны Дню жанчын. Яны трымалі беларускія сьцягі і плякаты ў абарону правоў беларускіх жанчын.

*Сакавік. Віцебск.* На прыцягу студзеня-сакавіка віцебскія актывісты *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* ***Уладзімер Плешчанка*** і ***Барыс Хамайда*** рэгулярна праводзілі адкрыты збор подпісаў за незалежнасьць Беларусі ў цэнтры Віцебску. Міліцыя некалькі разоў затрымлівала іх і дастаўляла ў пастарунак, але яны зноў працягвалі акцыю пратэсту.

*14 сакавіка ў Магілёве* выключылі з унівэрсітэту актывістку „Маладога Фронту”***Ганну Зюзіну*** — студэнтку IV курсу філялягічнага факультэту. (Леташняй восеньню Ганна прымала актыўны ўдзел у кампаніі байкоту выбараў у лукашэнкаву „палату”. У кастрычніку 2000 г. яе ўжо выключалі з унівэрсітэту, але пасьля абскарджаньня загаду аб выключэньні яна была адноўлена ў ліку студэнтаў.) Дзяўчына ўпэўненая, што гэтае выключэньне — працяг ціску на яе з боку адміністрацыі ВНУ.

*15 сакавіка ў Барысаве* адбылася акцыя ў падтрымку зьняволенага на 15 сутак ***Антона Цялежнікава***. Падчас акцыі былі затрыманыя ***Зьміцер Бародка*** і ***Зьміцер Фядорчанка***. Іх даставілі ў аддзяленьне міліцыі.

*15 сакавіка ў цэнтры Менску* сябры Маладога Фронту правялі несанкцыянаваную акцыю з нагоды Дня Канстытуцыі. Яны віншавалі жыхароў і дзяржаўных чыноўнікаў, раздавалі ўлёткі пад назовам „Канстытуцыя-2001”. міліцыянты затрымалі, заштурхнулі ў машыну і адвезьлі ў пастарунак ***Руслана Харкевіча*** і ***Кірылу Раўтовіча***.

*19 сакавіка* на вакзале ў Менску да ***Андрэя Сінякова*** падышоў супрацоўнік міліцыі і папрасіў прад'явіць дакуманты. Андрэй спытаў

па-беларуску: „У чым справа?” Беларуская мова выклікала падазрэньні ў міліцыянта і хлопца затрымалі.

*20 сакавіка* ў судзе Цэнтральнага раёну Менска суддзя *Ільіна* задаволіла патрабаваньне пракурора *Рамашэўскага* і вынесла прысуд *Валерыю Шчукіну* —арышт тэрмінам на 3 месяцы па арт. 339 ч.1 (хуліганства) Крымінальнага кодэксу Беларусі. (16 студзеня В.Шчукін спрабаваў сілком прайсьці на прэс-канфэрэнцыю Міністра Унутраных справаў у МУС Беларусі, куды ён ня быў запрошаны. Але трое супрацоўнікаў аховы будынку павалілі яго на падлогу. У час тузаніны было разьбіта шкло ў дзьвярах, аб якое сам жа Шчукін і парэзаўся. Раны былі такія сур’ёзныя, што яго адвезьлі ў вайсковы шпіталь у аддзяленьне мікрахірургіі. Праз тры месяцы адбыўся суд.)

*21 сакавіка, Баранавічы.* Вечарам трох невядомых мужчынаў у скураных куртках напалі на старшыню гарадзкой арганізацыі БНФ „Адраджэньне” ***Алеся Пікулу*** і зьбілі яго да страты прытомнасьці. Забралі грошы, нататнік, ключы, пашпарт і іншыя дакуманты.

*22 сакавіка, Берасьце.* Берасьцейская „вертыкаль” забараніла правядзеньне ў горадзе масавых акцыяў у Дзень Незалежнасьці.

*24 сакавіка ў Жодзіне* і *Смалявічах* адначасова (у другой палове дня) былі праведзеныя 7 пікетаў: 4-ы — у Жодзіне, 3-ы — у Смалявічах, арганізаваныя прадстаўнікамі моладзевых нацыянальна-дэмакратычных арганізацыяў рэгіёну з кааліцыі „Ліцьвінаў” ( *БЗМ „Ліцьвіны”, Малады Фронт, ТБМ імя Ф. Скарыны, БНФ „Адраджэньне” і інш.*). Падчас пікетаваньняў раздавалася „Усеагульная дэклярацыя правоў чалавека”, „Канстытуцыя 2001” з заклікам да пераменаў і ўдзелу моладзі ў перавыбарах прэзыдэнта, іншая літаратура і газэты, зьбіраліся подпісы за стварэньне Нацыянальнага ўнівэрсітэту ў Менску.

*24 сакавіка* кааліцыя моладзевых арганізацыяў Віцебску на чале з *Маладым Фронтам* (*Задзіночаньне беларускіх студэнтаў, Цэнтар моладзевых ініцыятываў „Контур”, Беларуская музычная альтэрнатыва, АГП) правяла* пікет, прысьвечаны праблемам моладзі. Удзельнікі трымалі плякаты: „Сёньня памірае моладзь — заўтра загіне народ”; „Пакуль улада вядзе палітычныя гульні, што рабіць моладзі?; „Хто плоціць такія заробкі, на якія нельга ўтрымліваць сям’ю?”; „Праблемам моладзі — першачарговае вырашэньне”; „Калі ты быў жабраком у маладосьці, кім ты будзеш заўтра?”. Над удзельнікамі лунаў вялізны сымвал акцыі: „Моладзь патрабуе пераменаў!”. Жыхары горада выказалі сваю падтрымку пікетоўцам.

*24 сакавіка, Віцебск.* Міліцыя затрымала ***Віталя Фралова***, які распаўсюджваў газэту „Наша свабода” (зарэгістраванае выданьне, рассылаецца па падпісцы).У пастарунку склалі пратакол і канфіскавалі 47 асобнікаў газэты.

*24 сакавіка ў Менску* раніцай сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Яўген Ігнатовіч*** разносіў па кватэрах сяброў Партыіі БНФ інфармацыйныя матэрыялы ўнутранага карыстаньня (інфармацыйныя бюлетэні, аб’явы). На вуліцы Бельскага каля дома №19 яго затрымаў міліцыянт. Капітан міліцыі **Чумік** склаў пратакол ды паведаміў, што ўсе матэрыялы будуць перададзеныя ў пракуратуру.

*Напярэдадні 25 Сакавіка* невядомыя патрыёты паклапаціліся, каб *Гомель* сустрэў сьвята, расквечаны нацыянальнымі колерамі і распісаны актуальнымі лёзунгамі. На гарадзкіх сьценах зьявіліся надпісы і малюнкі. У цэнтральнай частцы горада і ў некаторых мікрараёнах горада дрэвы былі ўпрыгожаны *Бел-Чырвона-Белымі* папяровымі сьцяжкамі.

*25 сакавіка.* Сёлета Беларускі Народ зноў сьвяткаваў Дзень Незалежнасьці — 83-я ўгодкі абвяшчэньня незалежнай *Беларускай Народнай Рэспублікі.* Сябры *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* адзначылі найвялікшае нацыянальнае сьвята ў цэнтры беларускай сталіцы.

Нягледзячы на запалохваньні рэжыму і абяцаньні расправы за збор у цэнтры Менску, больш за 500 асобаў а 12-й гадзіне сабраліся каля плошчы Незалежнасьці і ўзьнялі *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі.* Калі



***Расейцы сьвяткуюць юбілей аўтамата.***

міліцыя паспрабавала забараніць людзям збор на гэтым месцы — усе засьпявалі „***Магутны Божа”***. А $12^{20}$ дэманстранты рушылі па праспэкце Францыска Скарыны пад нацыянальнымі сьцягамі і гукаючы „Жыве Беларусь!”, „Незалежнасьць!”

Упершыню (пасьля 1997 году) сьвяткаваньне Дня Незалежнасьці адбылося на цэнтральнай артэрыі сталіцы. Настрой быў радасны і сьвяточны. Людзі віншавалі адзін аднаго, шмат хто далучыўся да шэсьця, было шмат маладых людзей.

Каля крамы ГУМ на вул.Леніна праспэкт перагарадзіў ланцуг амонаўцаў у чорных касках з дубінкамі. Улады, відаць, баяліся, што народ будзе штурмаваць лукашэнкаву рэзыдэнцыю, якая знаходзіцца непадалёк.

Выконваючы абавязкі старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Юры Беленькі*** зьвярнуўся да людзей. Ён павіншаваў іх са сьвятам, запэўніў, што „мы будзем сьвяткаваць Дзень Незалежнасьці ў цэнтры сталіцы і іншых нашых гарадоў, не хаваючыся на задворках”. Заклікаў людзей працягнуць сьвяткаваньне дома, з сябрамі і сем’ямі. Быў зачытаны зварот старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ *Зянона Пазьняка.*

Сябры Беларускага Вызвольнага Руху адзначылі Дзень Незалежнасьці маніфэстацыямі, шэсьцямі, пікетаваньнямі, урачыстымі сходамі ва ўсіх абласных цэнтрах і многіх гарадах Беларусі.

Былі затрыманьні. Рыхтуюцца суды.

*25 сакавіка* адбылося таксама шэсьце „аб’яднанай апазыцыі”, якое праходзіла па ўскраіне Менска: ад Юбілейнай плошчы да савецкай скульптуры па праспэкце Машэрава (раён так званага „камсамольскага возера”).

*Сакавік. Марына Коктыш:* „Дзеяньні арганізатараў шэсьця 25 Сакавіка ад Юбілейнай плошчы заслугоўваюць справядлівай крытыкі... Шэсьце трэба было ладзіць такім чынам, каб яно не было падобнае на пахавальную працэсію. А ўдзельнікі, прабачце, на палонных людзей. Не было ні прыгожа аформленых калёнаў, ні музыкі, ні песьняў. Арганізатары акцыі, парушыўшы дамоўленасьць з міліцыяй, ледзь самі ні справакавалі кровапраліцьцё на пр. Машэрава.

Сярод затрыманых удзельнікаў мітынгу ля стэлы на пр. Машэрава была і 15-гадовая ***Жэня Пікуль***. Двое дужых амапаўцаў схапілі яе за рукі і з размаху кінулі на прыступкі аўтобуса. Здаравенны дзяцюк у міліцэйскай форме, прыставіўшы да рота дзяўчынкі чорную дубінку, грозна вымавіў: „Паспрабуй толькі пікні…”

А далей Жэня ўбачыла самае сапраўднае пабоішча. На падлогу аўтобуса тварам уніз кінулі мужчыну і пачалі малаціць дубінкай па

спіне. Дзяўчынка-падлетак вымушана была назіраць, як міліцыянеры-«абаронцы» зьбіваюць затрыманых грамадзянаў і прыкладна на працягу гадзіны выслухваць брудную лаянку.

Праз дзве з паловай гадзіны Жэню перадалі прыбыўшай у райаддзел маці. Але за што яе схапілі, дзяўчынцы так і не патлумачылі. Быццам за парушэньне парадку. Толькі ў чым было парушэньне, участковы інспэктар Цэнтральнага РАУС, які складаў пратакол, так і не змог растлумачыць."

*25 сакавіка, Горадня.* Падчас сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці міліцыянты па-зьверску зьбілі непаўнагадовага ***Дзьмітрыя Ягорава***, карэспандэнта газэты „Біржа інфармацыі". Юнак з дыягназам „удар грудзіны, удар левай пераарбітальнай вобласьці, страсеньне мазгоў" трапіў у шпіталь хуткай дапамогі. Дзьмітры паспрабаваў сфатаграфаваць міліцэйскія фургоны. Да яго адразу падбеглі 5 міліцыянтаў, зламалі фатаапарат, пацягнулі ў грузавік. У машыне білі, паўтараючы „ну што, фатограф?" Абшуквалі і зноў зьбівалі. Потым юнака завезьлі ў міліцэйскі пастарунак, дзе катавалі каля дзьвюх гадзінаў. Прымушалі крычаць міліцэйскі дэвіз „честь отечества!" і білі, калі юнак адмаўляўся крычаць.

Міліцыянты завезьлі Дзіму пад будынак турмы і выкінулі з машыны.

*Сакавік.* Суддзя Цэнтральнага раёну Менска **Н. Вайцяховіч** прысусудзіла ўдзельнікам шэсьця „аб'яднанай апазыцыі" на Дзень Незалежнасьці: 10 сутак арышту ***Дзьмітры Чубарэнку***, 15 сутак ***Вінцуку Вячорку***, 10 сутак ***Алесю Бяляцкаму*** (за парушэньне парадку ў час дэманстрацыі).

*25 сакавіка ў Воршы* адбыўся пікет. Удзельнікі сьпявалі „***Магутны Божа"***, ***Яўгенія Казлова*** чытала вершы пра родны край. На сем пікетоўцаў было сем міліцыянтаў і кагэбістаў. За пікетоўцамі сачылі таксама з чатырох машынаў, здымалі на відэастужку.

На сьцяне Аршанскага гарвыканкаму нехта намаляваў *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*. Міліцыянты сьціралі яго паўдня. *(Юры Каньшка, Ворша)*

*25 сакавіка. У Віцебску* адзначалі Дзень Незалежнасьці. На пл. Волі сябры Партыі БНФ ***Іван Талпыга*** і ***Пётра Сарапеня*** раздавалі людзям бел-чырвона-белыя папяровыя кветкі й гірлянды. Тутака ж быў ***Уладзімер Плешчанка*** з нацыянальным сьцягам ды інфармацыйным плякатам, прысьвечаным 25 Сакавіка, ***Юры Карпаў*** са сьцягам і інш.

*25 сакавіка, Пінск.* На праспэкце Жалтоўскага ў раёне Гарпаліва невядомыя вывесілі вялікі транспарант на высакавольтнай лініі электраперадач, а ў іншым месцы — *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.*

На транспаранце (памерам прыкладна 5 мэтраў на 2 мэтры) з аднаго боку напісана „***Зянон, ратуй Беларусь!"***, з адваротнага — „***Лука — стоп!"***

Зроблены з тканіны транспарант невядомыя прымацавалі нават не да слупа, а да дроту, на адлегласьці некалькіх дзясяткаў мэтраў ад слупа. Па гэтай лініі перадаецца напружаньне памерам 110 тысячаў вольтаў. Да таго ж электрадрот знаходзіцца на вышыні больш за 20 мэтраў ад зямлі.

Правесьці сьвяточны мітынг з нагоды Дня Незалежнасьці пінскія ўлады не дазволілі.

*25 сакавіка, Пінск.* Сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і Народнага Фронту* наведалі вёску *Парэчча*, каб ушанаваць памяць Старшыні Ўраду Беларускае Народнае Рэспублікі ***Рамана Скірмунта***, які пахаваны ў Парэччы.

*25 сакавіка, Гомель.* На плошчы Паўстаньня адбыўся несанкцыянаваны сьвяточны пікет з нагоды 83-х угодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Пікет быў арганізаваны актывістамі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, якія выйшлі на плошчу пад нацыянальнымі сьцягамі, каб па беларускай традыцыі адзначыць Дзень Незалежнасьці, павіншаваць гараджанаў са сьвятам і зьвярнуць іх увагу на шматлікія парушэньні каляніяльнымі ўладамі палітычных і грамадзянскіх правоў беларусаў. Яны пратэставалі супраць зьнішчэньня беларускамоўных школаў, практыкі забароны гарадзкімі ўладамі правядзеньня беларускіх нацыянальных сьвятаў на плошчах горада, а таксама супраць этнічных чыстак беларусаў у ворганах улады і кіраваньня.

Падчас пікету прахожым раздавалі адмысловыя віншавальныя каляндарыкі і артыкул *Зянона Пазьняка „Амэрыка для амэрыканцаў".* Гамяльчане надзвычай прыязна паставіліся да акцыі, дзякавалі за віншаваньні, а некаторыя далучаліся да яе ўдзельнікаў. Паступова колькасьць людзей павялічылася. Калі ж на плошчу падышла вялікая група моладзі зь белымі і чырвонымі паветранымі шарамі і з прычэпленымі да іх нацыянальнымі сьцяжкамі, якія юнакі і дзяўчаты запускалі ў неба, пікет набыў яшчэ больш урачысты выгляд.

Хвілінаў праз 40 пасьля пачатку акцыі на плошчы Паўстаньня зьявіліся супрацоўнікі Цэнтральнага РАУС Гомеля на чале з намесьнікам начальніка падпалкоўнікам **Віктарам Дамненкам**. Да іх далучыўся і начальнік службы міліцыі грамадзянскай бясьпекі, спэцыяльнай міліцыі УУС Гомельскага аблвыканкаму, палкоўнік **Аляксандар Гаркоў**. Маёр з тэлекамэрай старанна фіксаваў на відэастужку ўсіх прысутных. Міліцыянты запатрабавалі, каб гамяльчане разыйшліся.

Затрымалі намесьніка старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімера Старчанку*** і сябра партыі ***Алесю Кацапаву***. На іх склалі пратаколы.

*25 сакавіка, Горадня.* У выніку сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці міліцыя затрымала і склала пратаколы на наступных асобаў: ***Сьвятлану Нех***, ***Вадзіма Саранчукова***, ***Сяргея Мальчыка***, ***Андрэя Мялешку***, ***Аляксандра Міхальчыка***.

*Сакавік. Слонім.* З-за адсутнасьці элемэнтарных рэчаў — шпрыцоў і нават бінтоў — лекарам Слонімскага раённага шпіталю неаднаразова даводзілася адкладваць тэрміновыя хірургічныя апэрацыі. Медпэрсаналу шпіталя пастаянна затрымліваецца выплата заработнай платы.

*26 сакавіка, Менск.* У Цэнтральным судзе Менску пачаліся суды над затрыманымі ўдзельнікамі шэсьця 25 сакавіка на праспэкце Машэрава. Затрымалі ***Максіма Кузьміцкага***, ***Віктара Бекеша***, ***Ніну Ярмалінскую***, ***Людзьмілу Гразнову***, ***Эліну Новік***, ***Максіма Куксу***, ***Міхася Валочку***, ***Зьміцера Чубарэнку***, ***Алеся Бяляцкага***, ***Вінцука Вячорку***, ***Язэпа Буркуна***, і інш. Жанчынаў перад судом зьмясьцілі на дзьве гадзіны ў камэру з мэталічнымі дзьвярыма, дзе звычайна ўтрымліваюць асабліва небясьпечных крымінальнікаў.

*26 сакавіка, Слуцк.* Адміністрацыйная камісія Слуцкага гарвыканкаму разгледзела справу ***Валянціны Івуць*** *(62 гады),* якую абвінавацілі ў незаконным захаваньні бюлетэня „***Беларускія Ведамасьці"*** і блізу 200 улётак, прысьвечаных гадавіне БНР.

Камісія пакарала В.Івуць грашовым штрафам (5 мін. заробкаў — гэта прыблізна 28 даляраў ЗША). Для спадарыні Івуць гэта надзвычай вялікая сума, бо амаль роўная яе пэнсіі па інваліднасьці.

На думку юрыста *Аляксандра Волкава,* В. Івуць пакаралі беспадстаўна, бо „*Беларускія Ведамасьці"* і ўлёткі яна толькі захоўвала ў сваёй кватэры, а не распаўсюджвала.

*28 сакавіка* за ўдзел у дэманстрацыі 25 Сакавіка штраф у 20 мін. заробкаў прысуджаны ***М.Валочку***. Папярэджанне атрымаў жыхар Ліды ***Дз. Кузьміцкі***.

*28 сакавіка, Менск.* За ўдзел у мітынгу на Дзень Незалежнасьці 25 Сакавіка грамадзяне ***Эліна Новік*** і ***Максім Кукса*** былі аштрафаваныя ў судзе Цэнтральнага раёна на 20 мін. заробкаў (арт.167-1,ч.2 КАП) суддзёй **Натальляй Вайцяховіч**.

*28 сакавіка.* Суддзя Ленінскага раёнага суда горада Бабруйска ***Юры Сушкоў*** атрымаў палітычны прытулак у Італіі.

Прызначаны на пасаду суддзі Лукашэнкам, ён першую сваю справу закончыў паводле загаду зьверху і ціску КГБ (гэта значыць, пакараў бязьвінных людзей). Потым за год працы Ю.Сушкоў тры разы выносіў апраўдаўчыя прысуды тым, каго ўлады патрабавалі пакараць.

Перад эміграцыяй ён даў прэс-канфэрэнцыю, дзе сказаў, што

беларуская судовая сістэма — частка рэпрэсіўнае сістэмы. Сумленная праца ў гэтай сістэме небясьпечная для жыцьця.

*29 сакавіка, Менск.* Нелегітымны кіраўнік Беларусі Лукашэнка здае шматлікія беларускія прадпрыемствы маскоўскім „гаспадарам”, у тым ліку і беларускі рынак піва.

Пратэстуючы, Малады Фронт правёў акцыю-пікет супраць паглынаньня рускім капіталам беларускіх прадпрыемстваў, супраць незаконнай распродажы рэжымам маёмасьці Беларусі.

„Вядома, што Лукашэнка здае аднаму з расейскіх манапалістаў „Балтыцы” увесь наш піўны рынак, — сказаў Павел Севярынец, — і моладзь хоча абараніць беларускага вытворцу.”

*29 сакавіка, Берасьце.* У судзе Ленінскага раёна (суддзя **О.С.Міранюк**) адбыўся суд над ***Алесем Чахольскім.*** 2-га сакавіка *А.Чахольскага* затрымалі ў цягніку на беларуска-польскай мяжы і канфіскавалі 745 асобнікаў бюлетэня „*Беларускія Ведамасьці”*. Суддзя прысудзіў А.Чахольскаму штраф у памеры 50 мін. заробкаў (гэта каля 300 даляраў ЗША). „*Беларускія Ведамасьці” „*как непосредственный объект административного правонарушения” (сказана ў пастанове суда), знаходзяцца на захаваньні ў Берасьцейскай мытні па вопісу №035896 і (згодна рашэньня суду) павінны быць перададзены ў „даход”(?) дзяржавы.

„Відавочна, што рашэньне было прынята палітычнае, — сказаў Алесь Чахольскі. — Ніякага нармальнага суда не было, а толькі фарс. Суддзя Міранюк выконваў устаноўку ўладаў, ад яго ўжо, практычна, нічога не залежыла.”

*31 сакавіка, Менск.* ***Алесь Швайко*** быў затрыманы міліцыяй на чыгуначным вакзале ў Менску. Ён паспрабаваў уручыць міліцыянтам *Зварот Беларускага Вызвольнага Руху да работнікаў міліцыі.*

*Сакавік.* **Лукашэнка** падпісаў дэкрэт №8 „Аб некаторых мерах па ўдасканаленьні парадку атрыманьня і выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі”. Паводле гэтага дэкрэта, фактычна, любая бязвыплатная дапамога (ці то грашовая, ці то матэрыяльная) павінна будзе рэгістравацца ў Дэпартаманце гуманітарнай дзейнасьці, які ўзначальвае памочнік Лукашэнкі **Віктар Кучынскі**. Без адпаведнай ліцэнзіі ад гэтага ведамства выкарыстоўваць замежную дапамогу забараняецца.

У дэкрэце дакладна рэглямэнтуецца пяць мэтаў выкарыстаньня замежнай дапамогі: для ліквідацыі наступстваў катастроф, правядзеньня навуковых дасьледваньняў, спрыяньня ахове прыроды і гістарычна-культурнай спадчыны, для медыцынскай і сацыяльнай дапамогі. У астатніх выпадках рашэньне аб тым, ці варта дазволіць замежнікам дапамагаць асобным беларускім грамадзянам, арганізацыям ці ўстановам, будзе прымаць ведамства Кучынскага і не самастойна, а пасьля ўзгадненьня з Лукашэнкам.

Фундатарам дэкрэт таксама пагражае пакараньнямі: закрыцьцём замежнага прадстаўніцтва ў нашай краіне і выгнаньнем зь Беларусі.

## *КРАСАВІК*

*Красавік.* Падрыхтоўку да 15-годдзя катастрофы на ЧАЭС пачалі адчуваць у Хвойніцкім раёне. Па традыцыі з пачатку новага года туды пачалі зьбірацца розныя дэлегацыі, больш цікаўнасьці сталі выяўляць СМІ. Часта тэлефануюць „зьверху”: „Як рыхтуецеся адзначыць?”

Старшыня Хвойніцкага райвыканкама ***Мікалай Садчанка*** распавядае: „Цэлых 10 гадоў пасьля аварыі раён знаходзіўся ў незразумелым становішчы. Спачатку яго запланавана было выселіць, таму законам было забаронена нават іржавы цьвік убіць ці штосьці аднавіць. Сёньня, калі ўсё можна рабіць, няма галоўнага – сродкаў.

У 1996 годзе былі перагледжаныя межы забруджаных тэрыторый. Восем вёсак, якія раней павінны былі адсяліць, пазбавіліся такога права. Як жыць у вёсцы, дзе было 250 двароў, пятнаццаці сем’ям, якія ня выехалі?

І гэта - без уліку таго, што яшчэ ў 6 вёсках ***342*** сям’і павінны быць адселеныя. Усяго ж родныя мясьціны пакінулі ***25 тыс***. жыхароў раёна, раён згубіў ***49*** населеных пунктаў, блізу 45% тэрыторыі трапіла ў зону адчужэньня” .

Яшчэ ў 1988 годзе, калі Мікалай Садчанка быў дырэктарам саўгаса „Судкова”, ён ужо казаў аб праблеме стронцыя, але ўлады сьцягвалі яго з трыбуны. Зараз не зьмянілася нічога, толькі прызналі наяўнасьць праблемы.

Раён займае першае месца у вобласьці па колькасьці выдадзеных лісткоў па часовай непрацаздольнасьці, па захворваньнях усімі формамі актыўнага туберкулёзу. Тут, на жаль, і самая высокая сьмяротнасьць.

*2 красавіка, Віцебск.* Скончыўся судовы працэс у Кастрычніцкім райсудзе па факце несанкцыянаванага моладзевага пратэсту супраць будаўніцтва пад Віцебскам нафтаперапрацоўчага заводу на грошы расейскіх бізнесоўцаў.



***Менск. Пейзаж з браневікам.***

Сябрам маладзёвай „экалягічнай ініцыятывы” за правядзеньне несанкцыянаванага пікету ***Ірыне Байдак*** і ***Эдуарду Бохану*** абвешчана папярэджаньне, а ***Сяргею Аксімовічу*** — штраф у 150 мін. заробкаў (гэта больш за 650 даляраў ЗША).

*2 красавіка.* Сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* выйшлі на вуліцы сталіцы на адкрыты збор подпісаў за незалежнасьць Беларусі, супраць акупацыі нашай краіны расейскай імпэрыяй, а таксама раздавалі тэкст Канстытуцыі Беларусі. Так патрыёты Беларусі адзначылі пятую гадавіну антынароднай змовы Ельцын-Лукашэнка. Грамадзяне актыўна ставілі свае подпісы ў абарону незалежнасьці, было сабрана некалькі сотняў подпісаў. Не баяліся прысутнасьці супрацоўнікаў міліцыі і КГБ. Не абышлося без затрыманьняў. Былі затрыманыя міліцыяй сябры партыі ***Валянціна Мароз***, ***Таццяна Цяцёркіна***, ***Тамара Сакольчык***, ***Сьвятлана Сачанка***, ***Сьвятлана Бельская***, ***Лідзія Пяньkоўская***, ***Уладзімер Кучараў***, ***Уладзімер Юхо***, ***Галіна Тамчук***, ***Уладзімер Цімашэвіч***.

На спробу абвінаваціць іх у парушэньні закону сябры Партыі адказалі, што выконваюць свой грамадзянскі абавязак па абароне незалежнасьці Беларусі ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй.

*2 красавіка.* Дэлегацыя *Маладога Фронту* з 4-х чалавек, якая накіроўвалася цягнікам у Маскву, уноч на 2 красавіка была абшуканая на станцыі Ворша супрацоўнікамі КГБ і крымінальнага вышуку. Цягнік затрымалі на некалькі гадзінаў. Вобыск быў праведзены ва ўсім

вагоне, дзе ехалі маладзёны. У ***Паўла Мягкова*** знайшлі тэкст лукашэнкаўскай дамовы РФ і Рэспублікі Беларусь. Яго ссадзілі з цягніка. Канфіскавалі ўлёткі і іншую літаратуру.

*2 красавіка.* Кіраўніцтва Берасьцейскай вобласьці вырашыла не выплочваць заробку ў калгасах і саўгасах да сканчэньня веснавой сяўбы. Гэтыя грошы накіруюць на закуп паліва.

Для гэтых самых мэтаў увесну ва ўсіх дзяржразьліковых прадпрыемствах Берасьцейшчыны забіраюць 1% ад прыбытку. Паводле словаў старшыні аблсавету **Леаніда Лемяшэўскага**, сяляне з разуменьнем паставіліся да рашэньня не выплачваць ім зарплату. „Яны лепш за іншых ведаюць, што ў выпадку зрыву веснавых работ можа адбыцца некіраваная сытуацыя",— сказаў ён.

*3 красавіка.* У Цэнтральны суд Гомеля выкліканыя намесьнік старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімер Старчанка*** і сябра партыі ***Алеся Кацапава***. Супраць іх, па ўказаньні зьверху, вядзецца адміністрацыйная справа за правядзеньне несанкцыянаванага пікету *25 Сакавіка.*

*3 красавіка ў Маскве* трое актывістаў Маладога Фронту і некалькі прадстаўнікоў маладзёвых дэмакратычных расейскіх арганізацыяў правялі пікетаваньне ДзяржДумы. Пікетоўцы трымалі ў руках *Бел-Чырвона-Белыя* сьцягі і плякаты ў абарону незалежнасьці Беларусі і



***Дэманстрацыя ў Горадні.***

супраць саюзу РФ і Рэспублікі Беларусь. Потым удзельнікі акцыі дэманстратыўна спалілі тэкст „саюзнай" дамовы. Іх адразу затрымала міліцыя і даставіла ў пастарунак. Там юнакоў пратрымалі некалькі гадзінаў, склалі пратакол аб правапарушэньні, ўручылі позвы ў суд і адпусьцілі. Беларусы суду чакаць ня сталі, а селі на цягнік і зьехалі дадому.

*3 красавіка, Менск.* У судзе Цэнтральнага раёну цэлы дзень судзілі ***Юры Беленькага***. Суддзя **Натальля Вайцяховіч** 4 разы рабіла заўвагі прысутным, каб тыя не рагаталі падчас апытаньня міліцыянта Маскоўскага РУУС капітана **Сідаркова**, які сцьвярджаў: „Беленькі быў арганізатарам акцыі з тае прычыны, што менш за ўсіх сьпяваў, а больш за ўсіх гаварыў". Капітан **Несьцярчук** паведаміў, што на акцыі 25 Сакавіка працаваў „у якасьці камэры у групе дакумэнтаваньня".

Юры Беленькі ў прамове адзначыў, што ня ведае, у чым яго віна, папрасіў ацаніць адпаведнасьць міліцэйскіх пратаколаў заканадаўству, бо калі яго і ўдзельнікаў мірнай сьвяточнай акцыі абвінавачваюць у тым, што размаўлялі па-беларуску ды сьпявалі беларускія песьні, дык гэта ёсьць рускі нацызм.

Суд так і ня змог патлумачыць, які артыкул Закону аб шэсьцях, дэманстрацыях, пікетаваньні парушыў Ю.Беленькі.

*4 красавіка, Менск.* У судзе Цэнтральнага раёну прадоўжылася судовае паседжаньне па адміністрацыйнай справе ***Юры Беленькага.*** Выконваючы абавязкі старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі - БНФ* Юрый Беленькі, па рашэньні суддзі **Наталлі Вайцяховіч**, быў асуджаны на 15 сутак адміністрацыйнага арышту ў спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку на вул. Акрэсьціна за арганізацыю 25 Сакавіка несанкцыянаванага мітынгу на праспэкце Францішка Скарыны ў Менску. 20 сябраў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* у судовай зале хорам крычалі: „Ганьба! Жыве Беларусь!"

Суд адбыўся з грубымі парушэньнямі заканадаўства. Усім відавочны быў заказ „з гары". Пры гэтым суддзя Вайцяховіч адмовілася весьці судовае паседжаньне і пратаколы па-беларуску.

*4 красавіка. Клічаўскі раённы суд (Магілёўская вобласьць)* пакараў старшыню *Клічаўскай арганізацыі Беларускага Народнага Фронту* ***Анатоля Белазерцава*** і актывіста ***Валеры Парфімовіча*** штрафамі ў ***3*** і **5** мін. заробкаў. Абвінавачваньне — парушэньне Адміністрацыйнага кодэксу (за распаўсюджваньне друкаваных выданьняў без выхадных дадзеных). 25 Сакавіка сябры Фронту распаўсюджвалі ўлёткі ***„Пастаім за Беларусь!"***.

*У ноч з 4 на 5 красавіка* супрацоўнікамі Цэнтральнага РУУС Менску былі затрыманыя ***Зьміцер Драпачка, Алесь Апарыч, Аляксей Шыдлоўскі, Цімафей Дранчук*** ля плоту з надпісамі: „Дзе Ганчар?", „Дзе Захаранка?", „Дзе Красоўскі?", „Дзе Завадзкі?" Міліцыянты паклалі затрыманых на зямлю, надзелі кайданкі і даставілі ў пастарунак. Супраць іх узбуджаная крымінальная справа па арт.341 КК (які ўступіў у дзеяньне ў 2000 г.): „Апаганьваньне збудаваньняў і псаваньне маёмасьці", які прадугледжвае адказнасьць у выглядзе „грамадзкіх працаў альбо штрафу, альбо арышту на тэрмін да трох месяцаў".

*5 красавіка* ў судзе Цэнтральнага раёну Менска адбыўся суд па адміністрацыйнай справе лідэра Маладога Фронту ***Паўла Севярынца***. Суддзя **Натальля Вайцяховіч** прыняла пастанову па арт. 167.1 ч.2 КаАП (арганізацыя несанкцыянаванага шэсьця) — 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

*5 красавіка, Менск.* А 23-й гадзіне *непаўнагадовы* ***Мікіта Сасім*** быў затрыманы міліцыянтамі, якія завезьлі яго ў пастарунак Маскоўскага раёну. Апэратыўны дзяжурны (прозьвішча не называў) зьбіваў юнака, катаваў, паліваючы валасы на галаве фарбай з балёнчыка. Юнаку надзявалі кайданкі. Склалі пратакол аб адміністрацыйным затрыманьні і правапарушэньні. Зноў пагражалі зьбіць яго, „засунуць у горла дубінку па самую рукаятку." Доўгі час юнак праседзеў у халодным памяшканьні ў адной майцы, бо куртку ў яго забралі. Надзявалі кайданкі, стралялі з пнэўматычнага пісталета над галавой, пагражалі электрашокерам. Пратрымаўшы амаль суткі (ежы не давалі), юнака адпусьцілі ўвечары 6-га красавіка.

*6 красавіка.* Паводле адваката ***Юры Беленькага Веры Страмкоўскай***, у справе Ю. Беленькага дайшло да грубай фальсіфікацыі, якую дапусьціў намесьнік начальніка РАУС **А. Барсукоў**: „Ён прадставіў суду сфальсіфікаваныя дакументы і рапарты супрацоўнікаў Цэнтральнага РАУС, дзе было напісана, што быццам бы Ю.Беленькі ішоў 25 сакавіка ад Юбілейнай плошчы да праспэкта Машэрава". Пры затрыманьні Ю.Беленькаму давалі падпісаць зусім іншы пратакол, у якім згадваўся праспэкт Францішка Скарыны.

*6 красавіка.* У цэнтры Віцебска змагары з рэжымам правялі несанкцыянаваны пікет пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі.* Яны распаўсюджвалі ўлёткі. праз 40 хвілінаў міліцыя затрымала ***Віктара Шляхціна, Юрася Корбана, Кастуся Смоліка*** і даставіла іх у пастарунак.

*6 красавіка.* У заяве, падпісанай сёлета ***Рыгорам Барадуліным, Уладзімерам Арловым, Генадзем Бураўкіным, Анатолем Вярцінскім*** і некаторымі іншымі гаворыцца: „Мы, сябры Саюза беларускіх пісьменьнікаў, патрабуем ад уладаў Рэспублікі Беларусь спыніць ганебнае шальмаваньне ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі сусьветнавядомага пісьменьніка Беларусі, вэтэрана Вялікай Айчыннай вайны ***Васіля Ўладзімеравіча Быкава***, якое ня робіць гонару ні нашае краіне, ні яе кіраўніцтву. Такога шалёнага і беспадстаўнага гвалту, паклёпу на Беларусі не было з 30-х гадоў, калі зьнішчаліся сотні беларускіх пісьменьнікаў, навукоўцаў і палітыкаў. Сёньня, нібы пераняўшы злачынныя і звыродныя сталінска-берыеўскія мэтады, Беларускае тэлебачаньне, выконваючы волю сваіх гаспадароў,

дагаварылася да таго, што змагар з фашыстам, вэтэран-франтавік **Васіль Быкаў** — „литературный полицай", што чалавек, які ўсё жыцьцё намагаўся паказаць у сваіх творах праўду, хоць і горкую, — „Василий, не помнящий родства"...

*7 красавіка* з ізалятару часовага ўтрыманьня выйшлі прызнаныя „падозранымі" па „справе графіці" ***Зьміцер Драпачка, Алесь Апарыч, Аляксей Шыдлоўскі, Цімафей Дранчук***. Само паняцьце „падозраныя" ўведзенае новым КК, які ўступіў у сілу ў 2000 г.

*У пачатку красавіка* ў Менску нявысьветленымі асобамі быў зьбіты адвакат ***Аляксандар Пыльчанка***, які абараняў М. Чыгіра і ягонага сына Аляксандра, а таксама сына Т.Віньнікавай Сяргея. А. Пыльчанка знаходзіцца ў шпіталі. Адвакат Гары Паганяйла лічыць, што ягонага калегу спрабуюць запалохаць, каб ён адмовіўся ад працы па справах, узбуджаных супраць вядомых у краіне асобаў і іх дзяцей.

*8 красавіка.* Супрацоўнікі Пракуратуры Рэспублікі Беларусь высадзілі зь цягніка і абшукалі старшыню выканкама АГП ***Яўгена Лабановіча***, які накіроўваўся ў Маскву для сустрэчы з вядучым тэлепраграмы НТБ „Независимое расследование" Мікалаем Нікалаевым. Ён вёз пакет дакумантаў пра зьніклых у Беларусі вядомых людзей. У прадстаўнікоў праваахоўных структураў быў ордэр на правядзеньне вобыску.

***Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і прэс-служба БНФ.*** *(Па матэрыялах Камісіі, СМІ (друку, радыё), „Вясны-96", SANA)*

## СХОД У КРАКАВЕ

2-га чэрвеня ў Кракаве адбыўся статутны сход *Камітэту „Польшча-Беларусь імя генэрала Станіслава Булак-Балаховіча".* На старшыню Рады Камітэту выбраны *Зянон Пазьняк.*



Пасьля паседжаньня група ўдзельнікаў Сходу наведала *Ракавіцкія могілкі*. Усклалі кветкі да магілы ***Алеся Гаруна***, а таксама на курган у гонар украінскіх ваяроў ***Сымона Пятлюры***.

У штаб-кватэры Камітэту адбылася канфэрэнцыя для прэсы з удзелам Зянона Пазьняка, потым дыскусія і абмеркаваньне палітычных дзеяньняў Камітэту.

***П.Я***

## ТАЯМНІЦЫ СЬЛЯПЯНСКАГА ЛЕСУ

*Пасьля дасьледваньня Курапатаў мне стала вядома пра шмат месцаў энкавэдзісцкіх расстрэлаў людзей у Беларусі. Пра Лошыцу ў Менску я неабачліва расказаў раней часу і (як вынік неабачлівасьці) дасьледваць не пасьпеў. У 1988 годзе камуністы апэратыўна зьнішчылі месца расстрэлаў у Лошыцы. Засыпалі магілы шматмэтровым пластом галечнага жвіру, заасфальтавалі, пабудавалі на іх аўтастаянку і гаражы.*

*Потым для мяне пачалася „актыўная палітыка", выйсьці зь якой было немагчыма. Дасьледваньні я адкладваў на будучыню, якая, здавалася мне, вось-вось настане.*

*Але настала такая будучыня, калі пяцігадовае егіпецкае напружаньне і актыўная праца ў Вярхоўным Савеце сталі часам здавацца мне спакоем, па параўнаньні з тым, што было потым ў эміграцыі.*

*Я шмат чаго не пасьпеў. Напрыклад, я так і ня змог спаткацца і паразмаўляць са сьведкамі камуністычных расстрэлаў у Сьляпянскім лесе пад Менскам, каб дакладна вызначыць месца для дасьледваньня і потым дасьледваць пахаваньні. Цяпер ужо, відаць, страчаны гэты чалавечы час. Дакуманты наўрад ці засталіся.*

*Нядаўна, гартаючы стосы газэты „Бацькаўшчына" ў царкве Кірылы Тураўскага ў Брукліне, я наткнуўся на артыкул „Таямніцы Сьляпянскага лесу", падпісаны крыптанімам* ***„Ул. Д."*** *Піша сьведка, які пацярпеў за тое, што ўбачыў. Тут мы перадрукоўваем гэты ўспамін пра страшную даўніну.*

*Зянон ПАЗЬНЯК*

* * *

За Менскам, на шостай вярсьце ад Парку Культуры й Адпачынку, у лесе Малой Сьляпянкі, пахаваныя вялікія таямніцы жыцьця. Сьляды страшэннага злачынства пазарасталі даўно мохам і травою, але памяць не спялмілася часам.

Я хачу расказаць пра тое, што бачыў на ўласныя вочы, і пра тое, што гаварылі мне жывыя сьведкі ды апавядальнікі чутага ад іншых. Ня ведаю, дзе цяпер гэтыя людзі. Бальшыня зь іх, напэўна, загінула ў канцэнтрацыйных лягерах у Сібіры, а косьці іншых, магчыма, буцьвеюць у тым самым Сьляпянскім лесе... Пра гэтую праўду не напіша ніколі ні маскоўская „Праўда", ні менская „Зьвязда".

1932 год. Студэнты менскага Педагагічнага Тэхнікуму імя Ўсевалада Ігнатоўскага, а сярод іх і я, адбывалі на Дасьледчай Станцыі ў Малой Сьляпянцы сваю месячную сельскагаспадарчую практыку. Дырэктар станцыі папярэдзіў: ***„За дзьвесьце мэтраў ад баракаў пачынаецца ваенная зона, хадзіць туды забараняецца!"***

Аднаго дня наказалі мне, што бацькоў выгналі з калгасу, а старэйшага брата пасадзілі ў турму. Хацелася йсьці на край сьвету. Надвечар я паклікаў блізкага сябру Сяргея Русаковіча, маладога беларускага пісьменьніка, і мы, нікому нічога ня кажучы, падаліся ў лес. „Стары Барыс, што корміць канадыйскіх карпаў у сажалках, кожнага досьвітку бачыць „Чорнага ворана", а ў тэй у лесе камяніцы, — кажа ён, — ня дом адпачынку, а нейкая катавальня..."— гаворыць Сяргей.

„А Рэчыцкая, дачка камісара, гаворыць, што там поўна хворых, — заўважыў я. — Розныя ходзяць чуткі..."

Каля забалаці, улева ад чыгункі Менск-Масква, мы прачыталі напісанае чырвонымі літарамі:"КОНСКІ МОГІЛЬНІК. НЕБЯСЬПЕЧНА!" Мноства засыпаных і незасыпаных ямаў. Кавалкі гліняных трубаў, кучы хваёвых слупоў і скруткі калючага дроту. „Гэта, — гаворыць сябра, — для адводу вачэй... Барыс ведае ўсё чыста, папытайся толькі яго..."

Лес гусьцеў і рабіўся цямнейшым перад захадам сонца. У подыху вільгаці пахла трупнай гнілотай. І вельмі блізка... Пачалі шукаць. „Бачыш?"— з жахам зьвярнуўся я да Сяргея. Я дагэтуль не даваў веры, што можа ледзянець цела і заміраць сэрца. На плашчыні нейкіх трох гэктараў, паміж радамі пасаджаных у 1925 годзе хвоек, жаўцелі, размытыя пазаўчарашнім дажджом, маленькія курганкі і велікаватыя насыпы. Было іх, нешта, каля шасьцідзесяці на першым пляне, а далей — яшчэ... І яшчэ... Шмат якія былі заваленыя ламаччам.

Весткі з дому і пах магільнай чалавечай гнілі адурманілі галаву. Я адарваў вокладку Марксавага „Капіталу” і напісаў: ***„Пад якімі ж курганамі буцьвеюць косьці маіх братоў: Якуба, Уладзімера, Андрэя і Вінцэся?!”*** Вокладку насадзіў на сук галіны, што абдымалася з аброслым травою курганом. „Ты звар’яцеў, ці што?!” — з трывогаю крыкнуў Сяргей Русаковіч. Мне таксама хацелася крычаць і клікаць людзей шукаць родных і блізкіх. Пакідаючы мейсца вялікага бойнішча, гэткія словы вырваліся з грудзей:***”Пачакайце ж, бальшавіцкія далакопы!..”***

На скрыжаваньні лясных сьцежак убачылі мы некалькіх мужчынаў з рыдлёўкамі ў руках, абкружаных чырвонагаловымі энкавэдзістамі з сабакамі. Нельга было ўцякаць: перад намі стаяў ужо чалавек з ружжом. У вобразе гэтага двуногага зьвера я пазнаў рабатварага Васіля, Гіцля Бессардэчнага, як празвалі яго людзі маіх родных Дудзічаў. „Нешта вельмі шмат коней здыхае ў вас...” — сказаў я не




***Ігумен. Адкрыцьцё капліцы ў памяць пра расстраляных.***

вітаючыся. „Глядзі, разумнік, каб замест каня твая галава ня трапіла ў яму... Ідзі, каб і духу твайго не было тут... Пагаворым пазьней,” — аўтарытэтна выказаўся Гіцаль Бессардэчны.

Каля Дасьледчай Станцыі сустрэлі нас сябры: Сяргей Астрэйка, аўтар ненадрукаванай выдатнай „Бэнгаліі”, Сяргей Гайка, Касянкоў, брат Міхася Зарэцкага і студэнт Адам, пляменьнік Адама Бабарэкі. Апошні, моцна ўсхваляваны, паведаміў: „Дзядзька Барыс і студэнт Адрэмчык — арыштаваныя. Дырэктар пытаўся пра вас...”

Ноч была няпрыемнай і вельмі трывожнай. Усе драбніцы, як жывыя, стаяць перад маімі вачыма. Мне здаецца, што й цяпер яшчэ чую дзікі крык ратунку, які даносіўся тае начы да нашага слыху з-пад таемнае жоўтае камяніцы Сьляпянскага лесу.

28 лютага 1933 году вокладка Марксавага „Капіталу” зь імёнамі маіх братоў ляжала на стале сьледчага ў мурох менскага НКВД. Сухатварая Навіцкая, што часта наведвала рэдакцыю газэты”Савецкая Беларусь”, а пазьней і Малую Сьляпянку, гаварыла магільным голасам: „Вось мы і спаткаліся... Спадзяюся, што спаткаешся і з братамі...”

Увесну 1935-га году ў чырвоных мурох Марынскае турмы, у Сібіры, я пазнаёміўся зь Вячаславам Ануфрыевым, былым малодшым лейтэнантам менскага НКВД. Аднавокі сухотнік часта паўтараў мне: „Моцна пакараў мяне Бог за сьляпянскія душы... Ляжыць там ня менш дзесяці тысячаў.”

***Ул. Д.***

*(„Бацькаўшчына”, — 1956, 7 студзеня)*

# ЗАХОДНІЯ „ЗНАТАКІ” ПРА БЕЛАРУСЬ

## *Ён сустракаўся*

**Гэрбэрт Шнор** (нямецкі грамадзкі дзеяч): „Я сустракаўся зь Міністрам замежных справаў Латыпавым, з намесьнікам кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта (!) Замэталіным, старшынёй Фэдэрацыі прафсаюзаў Ганчарыкам. Я лічу няправільнымі дзеяньні па ізаляцыі Беларусі. Патрэбна не ізаляцыя, а дыялёг”. *(Народная Воля,— 2000, 26 кастрычніка)* (Ну, рыхтык Вік!)

## *Дэмакрат дэмакрату „друг”*

*Брытанскі штотыднёвік „Economist”:* „Беларускія нацыяналісты бачаць скасаваньне русіфікацыі вышэйшым прыярытэтам, іншыя больш нагадваюць лібэральна настроеных палітыкаў у Расеі, больш прыхільныя да дэмакратыі, чым да адраджэньня беларускай мовы, дрэнна вызначанай мовы, на якой размаўляюць, галоўным чынам, на вёсцы”. (Во, якія інтэлектуалы водзяцца ў „Эканамісьце”.)

## *Найдэмакратычная з найдэмакратычных*

Некаторыя заходнія палітычныя дзеячы, асабліва тыя, што кантактуюць з Гансам-Георгам Вікам, уражаныя прагрэсам дэмакратыі ў Беларусі. Летам 2000 года брытанскі дзяржаўны міністар **Кейт Вез** сказаў, што „беларускай апазыцыі” трэба прыняць удзел у парляманцкіх выбарах, бо ў Беларусі „прынятыя меры на паляпшэньне сітуацыі, павялічаны доступ апазыцыі да СМІ, унесеныя істотныя папраўкі ў Выбарчы Кодэкс. Акрамя таго ўрадам робіцца *ўсё магчымае*, каб стварыць перадвыбарны клімат, пазбаўлены *ўсялякага* палітычнага ціску”.

(Тым беларусам, якія раней палітыкай у Беларусі не цікавіліся, патлумачым, што ўсе прыведзеныя вышэй брытанскім міністрам „факты” ў рэальнасьці не існавалі і не існуюць.)

## *Дарам хлеб ня есьць*

Прадстаўнік ААН у Беларусі на прэсавай канфэрэнцыі з нагоды 52-й гадавіны зьяўленьня Усеагульнай дэклярацыі правоў чалавека пахваліў беларускі ўрад Лукашэнкі-Ярмошына за дзеяньні ў галіне абароны правоў чалавека. *(Народная Воля,— 2000, 6 сьнежня)*

## *Геапалітык мінулага гарту*

**Зьбігнеў Бжэзінскі** (амэрыканскі палітоляг): „Сёньня тадышнюю Усходнюю Эўропу называюць Сярэдняй Эўропай, на ўсход ад якой знаходзяцца Ўкраіна і Расея”. *(Rzeczpospolita, — 2001, 31 maja)*

***Сабраў Адам МІКША***

# АБ’ЯВІЎСЯ СЯБРА УЛАДЗІМЕРА КАРАТКЕВІЧА

У 1988 годзе, калі імкліва нарастала незадавальненьне камуністычнай уладай на Беларусі, усе змагары з савецкім рэжымам, напэўна, добра памятаюць прапагандысцкія опусы супраць *Народнага Фронту* і беларускай інтэлегенцыі, якія зьмяшчаліся ў савецкіх газэтах. Найбольш уразіў тады ўсіх па ўзроўню гнюснасьці паклёпу і

„гразенапоўненасьці" артыкул **Уладзімера Левіна „**Пена на хвалі перабудовы". Гэты артыкул супраць беларускага адраджэньня быў напісаны ў БЕЛТА па заказу ЦК КПБ і належыў да „літэрнага" разраду (гэта значыць быў абавязковы для надрукаваньня ва ўсіх газэтах, у тым ліку і раённых). Сам У.Левін працаваў тады загадчыкам аддзелу БелТА. Яго пасада кваліфікавалася як журналісцка-прапагандысцкая намэнклятура кампартыі.

Гэтым артыкулам камуністы далі сігнал для траўлі ўсяго беларускага, вольнага і нязгоднага з палітыкай КПСС. Апагей перасьледу быў дасягнуты 30 кастрычніка 1988 года, *на Дзяды,* калі камуністычныя ўлады падрыхтавалі шырокамаштабную правакацыю супраць *Беларускага Народнага Фронту* з мэтай зьнішчыць новае беларускае Адраджэньне.

Потым падзеі разьвіваліся сваёй дарогай. Кардынальна перамянілася сітуацыя, разваліўся СССР, Беларусь аднавіла незалежнасьць і ўсё, што было ў 1988 годзе, стала амаль што гісторыяй (якую, аднак, цяпер, па пэўных прычынах, найбольш ня ведае якраз маладое пакаленьне).

Нядаўна, пераглядаючы мінулагоднія выразкі з ньюёркскіх газэтаў, я натрапіў на артыкул Уладзімера Левіна ў габрэйскім рускамоўным выданьні „Интересная газета", рэдактарам якой быў той самы У.Левін. Ён завёў „старонку рэдактара" і друкуе свае артыкулы-назіраньні, меркаваньні ды ўспаміны (нездарма газэта „интересная"). Вось, напрыклад, што ён піша пра Ўладзімера Караткевіча:

„З Уладзімерам Караткевічам мы частавата сядзелі каля бронзавых лягушак Купалаўскага скверу, назіраючы са сьмехам, як шпацыруе чыноўны люд беларускага ЦК: яны маршыравалі свой пасьляабедны мацыён чародамі — інструктары асобна, загадчыкі сэктараў самы па сабе, не перамешваючыся. Усё па рангу. А загадчыкі аддзелаў і тыя, хто вышэй, каціліся на абед на чорных і белых „волгах". Сьмешна было глядзець на гэтую чыноўную „нечалавечую камэдыю", і Караткевіч параіў мне: „Напішы пра гэта! Не цяпер, калі-небудзь."

— А каму гэта будзе цікава ў тыя часы, калі разьбіта будзе хлусьня?

— Нікому, — згадзіўся Валодзька. — Але Даўлатаў пра гэта б напісаў...

Лёсы майго сябра Уладзімера Караткевіча і Сяргея Даўлатава, якога я ніколі ня бачыў, але чытаў усё, што ён напісаў, падобныя, як набоі ў абойме. Абодва загінулі па адной прычыне і ў адзін год. Гарэлка — гэта тое болеутаймоўваючае душы, якое немагчыма ўжываць бясконца"... і г.д.

У канцы У.Левін растлумачыў палітычныя погляды У.Караткевіча. „Нацыяналісты ўзьнялі Караткевіча на шчыт і зрабілі сваім сьцягам, хаця Валодзя Караткевіч ніколі нацыяналістам ня быў. Кнігі Караткевіча забаранялі, рассыпалі набор." *

Вось такія зьявы бываюць у жыцьці праз 12 гадоў пасьля „перабудовы".

***М.ВАНЬКЕВІЧ***

---

* Интересная газета, — 2000, 30 жніўня (*Нью-Ёрк*)

# СВАБОДА

Воля, свабода... Словы амаль магічныя. Яны неяк па-асабліваму ўспрымаюцца. У мяне слова „свабода" выклікае ўяўленьне шырокага сьветлага прастору, дзе вее цёплы лагодны вецер. Несвабода асацыюецца зь нечым замкнутым, прыгнечаным і абмежаваным, без далягляду і пераменаў.

Праявы несвабоды я назіраў з самага раньняга дзяцінства, тады, калі пачалася савецкая калектывізацыя. Пад акупацыяй воля не існуе. Беларус быў бяспраўны. Расейцы зьдзекваліся з нашых сялянаў, як хацелі. Гэтыя карціны зьдзеку бальшавікоў над людзьмі мне і цяпер стаяць у вачах. Сам жа я непасрэдна сутыкнуўся з несвабодай ужо тады, калі асэнсоўваў свабоду як сваё і наша агульнае беларускае права (а не як нейкае маё хаценьне).

Памятаю, калі я яшчэ вучыўся ў 9-м клясе ў школе, прыйшоў да нас у керзавых ботах дырэктар-расеяц і сказаў, што з наступнага дня ён будзе выкладаць у нас гісторыю па-руску, дык каб мы яму і адказвалі па-руску.

Тады мы цэлым клясам пастанавілі, што па-руску яму адказваць ня будзем. Кірзач ставіў нам усім за гэта „калы" і „двойкі". Праз нейкі час я ад імя кляса запатрабаваў, каб ён спыніў свой экспэрымэнт і стаў нам чытаць лекцыі на нармальнай мове. Дырэктар спасылаўся на Леніна, маўляў, Ленін гаварыў па-руску. „Але вы ня Ленін, — сказалі мы дырэктару, — вось калі да нас прыйдзе Ленін, тады мы зь ім і пагаворым."

Праз нейкі час у нас зьявіўся новы настаўнік гісторыі і, як ні ў чым ні бывала, пачаў весьці заняткі па-беларуску.

Гэта была наша інтэлігентная перамога, бяз крыку і шпурляньня чарнілак у непрыяцеля. Мяне гэта ўмацавала тады ў думцы, што толькі той несвабодны, хто не змагаецца за свабоду. Свабода сама не зьяўляецца. За яе трэба змагацца, а потым — абараняць.

* * *

Дэфініцыя свабоды ўмяшчаецца ў тры словы. Свабода гэта ёсьць ***магчымасьць тварыць дабро***.

Пра свабоду мы гаворым толькі тады, калі ***існуе*** такая магчымасьць. Калі такой магчымасьці няма — мы кажам, што ***няма*** свабоды.

Калі ж свабода выкарыстоўваецца на зло — яна ператвараецца ў несвабоду. Тады чалавек альбо робіцца нявольнікам сваіх страсьцяў, злых думак і паводзінаў, альбо, ў выпадку антысацыяльных дзеяньняў, трапляе ў турму і траціць свабоду ў літаральным, фізічным сэнсе. Прытым нікому не прыходзіць у галаву змагацца за свабоду крымінальнікаў, гвалтаўнікоў ды забойцаў. Наадварот, патрабуюць абмежаваць іхнюю свабоду.

Істотна зазначыць, што свабода ёсьць ***маральная катэгорыя***. Яе адлюстраваньне ў канкрэтных каштоўнасьцях залежыць ад маралі і ўзроўню культуры грамадзтва. Тым часам гэта ёсьць катэгорыя ***аб'ектыўная***. Рэлятывісцкі падыход тут памылковы і прыводзіць да зьнішчэньня свабоды. Дадам яшчэ, што ў філясофскім сэнсе, свабода — гэта ***магчымасьць вечнага разьвіцьця да ідэалу***.

Свабода зьвязана з сьветапогляднай і маральнай арыентацыяй чалавека. Таму дэкляраваньне барацьбы за свабоду і сама барацьба за свабоду яшчэ мала што тлумачаць і вымагаюць канкрэтызацыі — у чым справа. Часта выяўляецца, што некаторыя людзі, якія змагаюцца за свабоду, на справе маюць на ўвазе толькі свае інтарэсы, прытым даволі эгаістычныя, суб'ектыўныя і заганныя. Цяпер, у час усеагульнага крызісу дэмакратыі, мы бачым, як нарастае агрэсіўнасьць сацыяльнай цемры ў грамадзтве. ***Дрэнь змагаецца за свабоду***. Масы цёмных суб'ектаў у розных краінах патрабуюць легалізацыі наркотыкаў, свабоды прастытуцыі, распусных палавых дачыненьняў, ліквідацыі інстытуту сям'і, свабоды абортаў і г.д.

Шматаблічная катэгорыя свабоды патрабуе, перш за ўсё, дакладнай кадэфікацыі ў праве і выразнай вызначальнасьці ў сістэме маральных каштоўнасьцяў грамадзтва. Агульнасьць і расплывістасьць праўных фармулёвак свабоды можа стаць прычынай апраўданьня абсурду і несвабоды чалавека.

Рэкардсмэнам такога абсурду зьяўляецца якраз „свабодная" Амэрыка. Тыповы прыклад. У Нью-Ёрку ўдарыў мароз. Гэта вялікая пагроза для бяздомных, апушчаных людзей і наркаманаў, якія начуюць на вуліцах. Паліцэйскі разбудзіў бяздомную жанчыну-наркаманку, што ляжала пад сьцяной, і, ня гледзячы на яе супраціў, завёў у цёплую станцыю мэтро, каб яна там пераначавала і не замерзла. Праз нейкі час паліцэйскага пацягнулі ў суд і паліцэйскае ўпраўленьне было аштрафаванае на 500 тысячаў даляраў за парушэньне правоў наркаманкі ляжаць на вуліцы і дзе яна хоча. Паліцэйскі, згодна

азначэньня суда, парушыў фундамэнтальнае права асобы — яе свабоду.

Некаторыя амэрыканцы нават з гонарам расказвалі мне пра гэта — во якая ў нас свабода. На самай справе тут звычайны (а ў нашым разуменьні — шарлатанскі) амэрыканскі бізнэс. Знайшоўся нікому не вядомы адвакат, які падгаварыў бадзяжку зьвярнуцца ў суд і, карыстаючыся агульнасьцю вызначэньня заканадаўства і фармалізацыяй мысленьня суддзяў (такое магчыма толькі ў Амэрыцы), выйграў працэс „абароны свабоды”.

Адвакат такім чынам зрабіў сабе бясплатную рэкляму (бо абсурдальнасьць падзеі прыцягнула ўвагу друку) і ў дадатак яшчэ зарабіў грошы (звычайна, ад 25 да 50 адсоткаў ад сумы „судовага выйгрышу”, гэта значыць, штрафу).

Гэта вельмі тыповы для Амэрыкі прыклад, дзе бог — даляр, а свабода — сродак бізнэсу. Ні адваката, ні суддзяў, ні журналістаў, ні разьзявакаў, што цікавіліся зьявай, не абходзіла жыцьцё бадзяжкі. Яны не асэнсоўвалі нават фальшывасьці сваёй пазыцыі. Адзіным чалавекам у гэтай гісторыі, які меў жаласьць у сэрцы і цаніў жыцьцё іншага чалавека як найвялікшую каштоўнасьць, быў амэрыканскі паліцэйскі, якога пакаралі.

* * *

Свабода — гэта ўнівэрсальны прынцып Сусьвету як Боскага стварэньня, часткай якога ёсьць свабодная воля чалавека.

У сацыяльным грамадзтве абсалютны, унівэрсальны сусьветны прынцып свабоды ўзаемазьвязаны з маральнымі калізіямі духоўнага разьвіцьця чалавецтва. Гэтым абумоўлена тое, што свабода ў цывілізаваным сацыяльным грамадзтве ёсьць катэгорыяй выбару і не зьяўляецца найвышэйшай і абсалютнай каштоўнасьцю. Найвялікшымі каштоўнасьцямі ёсьць Бог, жыцьцё чалавека і жыцьцё народа. Там, дзе свабода ўступае ў канфлікт з гэтымі каштоўнасьцямі — там робіцца выбар. Ён можа быць розным. Гледзячы якія сілы, якія ўзроўні задзейнічаны ў супроцьстаяньні.

Глыбінная сутнасьць канфлікту змаганьня за свабоду выяўляецца ў пытаньні: ці можа існаваць ***свабода ўсяго?*** (А гэта значыць — і свабода зла.)У метафізічным сэнсе, які апэрыруе *вечнаснымі катэгорыямі*, такое становішча прызнаецца. (Бог даў свабоду Сатане. Але на пэўны час. Пакуль колькасьць упалых анёлаў не заменіцца адпаведнай колькасьцю справядлівых людзей. У гэтым — сэнс духоўнай гісторыі чалавецтва і зьмест барацьбы дабра са злом на Зямлі.)

Але сацыяльная практыка *дачаснага сьвету* (і дачаснага жыцьця) паказвае, што ў соцыюме не павінна быць свабоды злу, бо спыняецца духоўнае разьвіцьцё. „Не”, — гавораць злу свабодныя людзі. „Так”,— кажуць тыя, што хочуць іншай свабоды. „Так”, — кажуць лібэральныя заканадаўцы, якія лічаць, што прынцып свабоды павінен быць роўным для ўсіх: і для мільярдэра, які лётае зь Нью-Ёрка на Канкордзе паабедаць у парыжскі рэстаран (тры гадзіны лёту, 18 тысячаў даляраў туды й назад), і для бадзяжкі, што мае права замерзнуць на вуліцы, і для верных хрысьціянаў, што жывуць па запаведзях, і для дэградаванага збачэнца, што ўступае ў палавыя акты з жывёлай ці з сабе падобным (і, дарэчы, знаходзіцца ў Амэрыцы пад асобай аховай закону; гэта тут называецца „сэкс-меншасьць”).

Лібэралы глядзяць на свабоду, як той рускі Іван на агурковае поле, які садзіў агуркі, але ніколі іх не палоў. У выніку — замест агуркоў вырасталі чартапалох ды пустазельле. Затое — свабода: расьце, што хоча. Хоць вядома, што культура пачынаецца з абмежаваньня прыроднай свабоды (стыхіі), з абмежаваньня несвабоды (разбуральнай сілы).

Праклямацыя ў дэмакратычным грамадзтве свабоды без берагоў, „свабоды ўсяго” заўсёды ёсьць маніфэстацыяй заганнай цемры, патрабаваньнем свабоды злу, імкненьнем да легалізацыі чалавечай нізасьці.

Часта прыходзіцца чытаць, як у Нью-Ёрку злавілі тую ці іншую банду маладзёнаў у час нападу на краму. Калі паліцыя іх хапае, яны, звычайна, абураюцца, што парушаюць іхныя чалавечыя правы і што гэта дыскрымінацыя, таму што яны чорныя. Такая рэакцыя сярод злачынцаў вельмі распаўсюджаная. Яны шчыра думаюць, што іх заціскаюць, бо ў Гарлеме яны выраслі „абсалютна свабоднымі”.

* * *

У цэлым, аднак, свабода ў Амэрыцы добра рэглямантаваная і ўлічвае інтарэсы чалавека, бадай, як нідзе. Выдаткі, кур'ёзы, наступ зла ды абсурд, які пашыраецца, зьвязаны, перш за ўсё, з актывізацыяй левых ва ўсім сьвеце і лібэралаў на Захадзе, пасьля распаду сістэмы савецкага таталітарызму.

У заходнім грамадзтве зьнік страх перад камуністычным варварствам, і людзі расслабіліся, страцілі пільнасьць, сталі больш спакойна глядзець на сваіх левых сацыяльных і маральных экстрэмістаў, якія тут жа перайшлі ў наступ і ўжо шмат чаго дамагліся, і нават шмат дзе захапілі ўладу.

Выглядае парадаксальным, што маральны крызіс заходняй дэмакратыі і крызіс свабоды супаў па часе з крахам савецкага камунізму і таталітарнай сістэмы сацыялізму ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе. Захад, магчыма, з цягам часу пераадолее гэты крызіс. Але для нас, для беларусаў, якія змагаюцца яшчэ зь мінулым днём — рускім каляніялізмам у кагэбоўскай упакоўцы, — для нас важна зразумець, што каштоўнасьці дэмакратыі і свабоды, якія вязуць да нас з Захаду, гэта ў значнай ступені ***— лібэральны сурагат у дэмакратычнай абгортцы***. Ім, дэмакратычным лібэралам, важней узгадаваць тут, у нас, на Беларусі, сваіх гамасэксуалістаў ды фэміністак, ды экспартаваць на Беларусь адкіды сваёй культуры, чым сапраўды дапамагчы нам, беларусам, збавіцца ад расейскай каляніяльнай агрэсіі, абараніць беларускую мову ад зьдзеку і вынішчэньня, вярнуць беларускія школы і беларускую асьвету, умацаваць беларускую незалежнасьць і г.д. Іх не цікавяць праблемы нашага нацыянальнага выжываньня. Ім абходзяць, перш за ўсё, свае лібэральныя інтарэсы.

Пад гэтыя свае абмежаваныя паняцьці яны даюць невялікія грошы ды гранты бедным беларусам і плодзяць апазыцыйны пустацьвет, балбатуноў за дэмакратыю без суверэнітэту.

Менавіта гэтакая заходняя лібэральная „публіка” прычынілася да спробы зьнішчыць *Беларускі Народны Фронт* і расфармаваць яго ў „дэмакратычную апазыцыю” (у „балота”). З гэтага нічога не атрымалася, бо мы ўжо ведаем іхныя норавы і іхныя справы.

* * *

Для нас, беларусаў, свабода сёньня абазначае сьцісла канкрэтную і практычную задачу. Мы павінны, перш за ўсё, *збавіцца ад каляніяльнага прамаскоўскага рэжыму ўлады, спыніць агрэсію расейскай каляніяльнай палітыкі і гарантаваць бясьпеку і незьнішчальнасьць дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі*.

Дзеля гэтага мы павінны стварыць нацыянальнае кіраўніцтва краінай. Беларусяй павінны кіраваць: Беларускі нацыянальны ўрад, Беларускі нацыянальны парлямант і Беларускі нацыянальны прэзыдэнт. Беларусяй павінны кіраваць беларусы, а не расейцы і не расейская каляніяльная адміністрацыя.

Пра свабоду можна казаць толькі тады, калі мы будзем гаспадарамі ў сваім доме. Толькі тады — калі мы, беларусы, самы, як мы таго захочам, — будзем кіраваць і гаспадарыць у нашай Беларускай дзяржаве. І ўжо маючы такую свабоду, мы ніколі не скарыстаем яе на зло. ***Наша свабода стане для нашага народа Боскім стварэньнем шчасьця нашых людзей.*** І тут ужо нам трэба будзе пастарацца, каб не рабіць так, як заходнія лібэралы, і ня ўкінуць Сьвятую Свабоду ў гразь.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*5 траўня 2001 г.*
*Варшава*

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(па матэрыялах „Народнай Волі", „Пагоні", „БДГ", „Нашай Свабоды", „Вясны-96",SANA; студзень-красавік 2001 г.)*

■ На сусьветным рынку танк Т-72, якімі гандлюе Беларусь, каштуе да 200 тысячаў даляраў. Спэцыялісты лічаць, што ў Марока было прададзена прыкладна 50 танкаў за 2-3 гады. Гэты кантракт склаў каля 10 мільёнаў даляраў. І гэта толькі пятая частка беларускага гандлю танкамі. Куды ж пайшлі зробленыя грошы? Былы міністр абароны Павел Казлоўскі заяўляе, што беларуская армія з гэтага амаль нічога не атрымлівае, а ўсе прыбыткі асядаюць у „спэцыяльным прэзыдэнцкім фондзе" Лукашэнкі. Казлоўскі прывёў прыклад галоўнага вайсковага шпіталю, дзе сродкаў не хапае нават на лекі і бінты, не кажучы ўжо пра дарагое замежнае абсталяваньне. Становішча ў войску такое ж – тэхніка не абнаўляецца, заробкі афіцэраў надзвычай нізкія. А грошы з Марока ідуць на пабудову лядовых палацаў ды правядзеньне гучных зьездаў ды дэманстрацыяў народнай падтрымкі „першаму прэзыдэнту".

■ Дамову аб бестэрміновым шэфстве над экіпажам расейскага ракетнага крэйсера „Маршал Усьцінаў" падпісаў у Мурманску з камандваньнем паўночнага флоту Расеі старшыня Менгарвыканкаму Міхаіл Паўлаў. Раней такую ж дамову падпісала з адным з караблёў адміністрацыя Берасьця. Беларуская дэлегацыя падаравала экіпажу крэйсера каляровы тэлевізар ад імя ўраду. Глядзіш, і займеем свой флот у Запаляр'і, будзем „швэдам гразіць".

■ Малдова павінна ўвайсьці ў саюз РФ і Беларусі. Такую заяву зрабіў Уладзімер Варонін, старшыня кампартыі гэтай экзатычнай краіны, атрымаўшы перамогу на датэрміновых парляманцкіх выбарах. Кампартыя набрала 50,2% галасоў. Хрысьціянска-Дэмакратычная партыя (былы Народны Фронт) – 8,18%. І пайшло-паехала. Камуністы заявілі ўжо пра плян наданьня расейшчыне статусу другой дзяржаўнай мовы, пра ўмацаваньне сувязяў з Расеяй і СНД ды пра спыненьне эканамічных рэформаў, што праводзіліся з дапамогай міжнародных фінансавых арганізацыяў. Адным словам, Малдову чакае бліскучая будучыня...

■ Камандзёр 115-й зэнітна-ракетнай брыгады (штаб у Берасьці) падпалкоўнік Сяргей Лемяшэўскі абвесьціў пра падрыхтоўку ягонай часткі да вучэбных стрэльбаў на былым сакрэтным палігоне пад Столінам, што адбудуцца ў сакавіку. Пры савецтах 25 гадоў запар тут практыкаваліся ў ракетных стрэльбах авіятары Варшаўскага дагавору.Дарэчы, палескі палігон мае скандальную гсіторыю, як з прымусовым высяленьнем у 1963 г. шэрагу мясцовых вёсак, так і выкрытымі тут у 1980 г. высокімі ўзроўнямі радыяцыйнай забруджанасьці тэрыторыі, што адлюстравана ў навуковых манаграфіях. Палігон памерамі 50 на 70 км супрацоўнік інстытуту радыёбіялогіі АН Беларусі Уладзімер Бажанаў параўноўваў з ядзернай выспай, вылучаючы вэрсію, што тут маглі адбывацца сакрэтныя выпрабаваньні ядзернай зброі.

■ Дадзеныя Міністэрства ўнутраных справаў дэманструюць істотную розьніцу ў крымінагенным становішчы на захадзе і ўсходзе Беларусі. Розьніца амаль удвая. Гэтак, на Гомельшчыне у 2000 г. было зьдзейсьнена 1623 злачынствы на сто тысячаў жыхароў, на Магілеўшчыне – 1557, а вось за той жа час на Берасьцейшчыне – 811, на Гарадзеншчыне – 923. Пра Віцебшчыну міністар МУС Уладзімер Навумаў сказаў, што там злачыннасьць самая высокая. (І да Расеі рукой дастаць.)

■ *23 лютага* А.Лукашэнка падпісаў указ , якім „за образцовое ісполненіе воінкого долга, высокое профессіональное мастерство і особые заслугі в охране госграніцы" узнагародзіў сярод іншых памежнікаў капітана Лукашэнку Віктара Аляксандравіча. Граніца, як кажуць, на замку, краіна можа спаць спакойна. Аднак незалежныя экспэрты мяркуюць, што беларускі народ не гатовы яшчэ да ўспрыняцьця ідэяў чучхэ і пераходу трону ў спадчыну.

■ У менскіх крамах выстаўлена на продаж вялікая колькасьць прадуктаў, тэрмін ужываньня каторых ужо даўно скончыўся: малако, сьмятана, сушкі, павідла. Танныя каўбасы выглядаюць так, што жахліва нават падумаць, што нехта іх можа зьесьці.

■ *Расейскі шпіянаж.* З прыходам да ўлады Пуціна, за якім стаіць КГБ і ваенна-прамысловы комплкс, Расея пачала абвастрэньне міжнародных адносінаў. На словах заяўляючы пра дружбу і мірнае супрацоўніцтва, Масква на самой справе вядзе інтэнсіўныя ваенныя прыгатаваньні. Энэргічна распрацоўваюцца і выпрабоўваюцца новыя віды зброі, парводзяцца пускі ракетаў і вучэньні войскаў, абнаўляюцца сувязі з адыёзнымі дыктатарскімі рэжымамі, узмацняецца прапаганда вайны і ваеншчыны, на ключавыя пасады ў дзяржаве прызначаюцца генэралы і адміралы, утвараюцца шматлікія псэўдапатрыятычныя арганізацыі, якія базуюцца на вялікадзяржаўнай шавіністычнай ідэі „вялікай Расеі", узмацняецца антызаходняя і антыамэрыканская рыторыка, улада канцэнтруецца ў адных руках. Адной з характэрных прыкметаў падрыхтоўкі Расеі да вайны ёсьць узмацненьне расейскай разьведвальнай дзейнасьці па ўсім сьвеце. Расейцы не абмяжоўваюцца сваёй таемнай прысутнасьцю ў краінах НАТО, але ўжо замахваюцца на таямніцы сваіх былых сяброў. Ды яшчэ крычаць „трымай злодзея!" у выпадку раскрыцьця іхных агентаў.

Ускладніліся расейска-баўгарскія адносіны. У Сафіі злавілі рускіх дыпляматаў на тым, што яны спрабавалі атрымаць канфідэнцыяльную інфармацыю, якая вельмі цікавіла Сэрбію. Не чакаючы афіцыйнай рэакцыі баўгараў на гэты эксцэс, Крэмль абвясьціў пра высылку з Расеі трох баўгарскіх дыпляматаў, нібыта за дзейнасьць, не сумяшчальную з дыпляматычным статусам. Баўгары адразу адказалі тым жа, што выглядала ўжо як акт помсты. Шмат хто з незалежных назіральнікаў мяркуе, што цяперашні крызіс на Ўкраіне арганізаваны пры актыўным удзеле агентаў Крамля і пятай калёны з расейцаў. Масква надта зацікаўленая ў дэстабілізацыі сітуацыі на Ўкраіне. Каб на хвалі незадаволенасьці прэзыдэнтам Кучмам прывесьці да ўлады прамаскоўскія сілы і спрыяць дзяржаўнаму перавароту па прыкладу Беларусі. *(Тамаш Пальмачынскі)*

■ Летась 10,3%ад агульнай колькасьці асабовага складу супрацоўнікаў ворганаў унутраных справаў Беларусі былі прыцягнутыя да крымінальнай альбо дысцыплінарнай адказнасьці. Міліцыянты ўчынілі 116 злачынстваў, сярод якіх — 4 наўмысныя забойствы, 7 цяжкіх цялесных пашкоджаньняў. Засмучае факт, што да адказнасьці прыцягваліся 149 (шточчацьвёрты!) начальнікаў альбо намесьнікаў аддзелаў міліцыі. Статыстыка бездакорна сьведчыць: міліцыянты ня толькі ўчыняюць злачынствы, яны яшчэ і замоўчваюць злачынствы іншых. За мінулы год зафіксавана 637 утоеных міліцыянтамі ад уліку і праверкі заяваў ды паведамленьняў грамадзянаў. Гэтая лічба павялічылася больш як удвая, у параўнаньні з папярэднім годам. 3781 крымінальная справа была распачатая пракурорамі па так званаму „адказному" матэр'ялу. Гэта значыць, што адпаведныя ворганы міліцыі не знайшлі альбо не хацелі знайсьці ў гэтых справаў крыміналу.

***Летась 30 чалавек, якіх даставілі ў міліцыю, загінулі ў пастарунках. Зь іх 4 скончылі самагубствам.*** Расьце колькасьць суіцыдаў сярод саміх міліцыянтаў. З 39 міліцыянтаў, што загінулі ў 2000 г. па-за службай, 16 (альбо 40%) скончылі жыцьцё самагубствам. Прычыны самыя штодзённыя: сямейныя сваркі, рэўнасьць, надзвычайная нагрузка на працы і п'янства. Пасьля п'янак на вуліцы замерзьлі два міліцыянты, яшчэ трох згубілі сваю зброю. ***П'янымі міліцыянтамі зьдзяйсьняецца што чацьвёртае дарожна-транспартнае здарэньне.*** Штодзясяты міліцыянт (а гэта толькі дадзеныя МУС, якое, зразумела, не зацікаўленае выносіць усе факты на грамадзкі суд) — злачынца альбо патэнцыйны парушальнік правапарадку.

■ 15 сакавіка вялікія „барацьбіты" за дэмакратыю і беларускі народ (ну, проста трыюмвірат: Марат, Дантон і Рабэсп'ер!) **Ул. Ганчарык**,

**П.Казлоўскі** і **М.Чыгір** апублікавалі ў СМІ сумесны „сьмелы” зварот пад шапкай „Нас не запугаць!” Там ёсьць усё: нелюбоў да Лукі, сантымэнт да дэмакратыі, нешта пра „победу справедлівості”... Але, відаць, самы галоўны пасаж — „Мы за реальное сотрудничество с Россией и налаживание дружеских отношений со всеми странами мира”. Значыць, з усімі дружба, а з Расеяй... З-за прызнаньняў выключнай ролі ўсходняй імпэрыі тырчаць лукашэнкавыя вушы. І зразумела, чаму мясцовыя рабэсп’еры-каштуніцы наладзіліся езьдзіць у Маскву.

■ Па выніках двух месяцаў 2001 г., прагграма ліквідацыі і мінімізацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы на 2001-05 гг.прафінансаваныя ўсяго на 10% ад гадавога пляну. Пра гэта паведаміў Уладзімер Цалко, старшыня Камітэту па праблемах наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Запазычанасьць Міністэрства фінансаў перад чарнобыльскім ведамствам на сёньня складае 5 мільярдаў рублёў (3 мільярды — па сацыяльных праграмах і 2 — па капітальным будаўніцтве). Урад абавязаўся фінансаваць усе чарнобыльскія мэрапрыемствы быццам бы ў прыярытэтным парадку. Аднак, падлікі паказваюць, што ніякага прыярытэту няма. Што дзіўна, самы надзейны электарат дыктатуры жыве якраз у чарнобыльскай зоне.

■ Лукашэнка распарадзіўся наладзіць пільны нагляд за іншаземцамі, якія бясплатна дапамагаюць беларусам. Ён падпісаў дэкрэт №8 „Аб некаторых мерах па ўдасканаленьні парадку атрыманьня і выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі”. Паводле гэтага дэкрэта, фактычна, любая бязвыплатная дапамога (ці то грашовая, ці то матэрыяльная) павінна будзе рэгістравацца ў дэпартаманце „гуманітарнай дзейнасьці”, якую ўзначальвае аўгансі гранатамётчык Кучынскі. Дэпартамант (пасьля ўзгадненьня з Лукашэнкам) будзе прымаць рашэньне, ці варта даволіць замежнікам дапамагаць асобным беларускім грамадзянам, арганізацыям ці ўстановам. Напрыклад, забаронена атрымліваць любую дапамогу з-за мяжы палітычным партыям і іх арганізацыйным структурам. Нават за аднаразовае парушэньне гэтай забароны партыю могуць пазбавіць рэгістрацыі.

Яшчэ большую пагрозу нясе дэкрэт незалежным СМІ і грамадзкім арганізацыям. Не сакрэт, што шмат якія зь іх атрымліваюць ад замежных фундатараў аргтэхніку ды іншыя прылады працы. Праваахоўныя і кантрольныя органы атрымалі права канфіскаваць замежную дапамогу, калі яна выкарыстоўваецца „не па прызначэньні”. Напрыклад, для вырабу і распаўсюджваньня агітматэр’ялаў ды іншых формаў агітацыйнай працы. Улады змогуць канфіскоўваць у незалежных СМІ падораныя замежнымі фундатарамі кампутары ды іншую тэхніку. Фундатарам дэкрэт пагражае пакараньнямі: закрыцьцём замежнага прадстаўніцтва ў нашай краіне і выгнаньнем зь Беларусі. Зразумела, што перад намі яшчэ адна прыкмета ледавіковага пэрыяду міжнароднай ізаляцыі нашага грамадзтва.

■ *Чэкіст-баскетбаліст*. Новым прэзыдэнтам Беларускай фэдэрацыі баскетболу стаў **палкоўнік КГБ, расеяц Леў Піменаў**. Ён быў абраны большасьцю галасоў на безальтэрнатыўнай аснове. Баскетбаліст працаваў раней ва ўпраўленьні КГБ па Магілёўскай вобласьці, потым у Нямеччыне (ахоўваў нацыста Геса ў турме Шпандаў — праверaны кадр!), у цэнтральным апараце КГБ ў Маскве. З 1995 г. кіруе „адным з падразьдзяленьняў” КГБ Беларусі. Гэта ня першы дзяржынец-алімпіец. Як вядома, былы старшыня КГБ Беларусі **Ул**. **Мацкевіч** узначальвае фэдэрацыю біятлону, былы начальнік службы бясьпекі „прэзыдэнта”, а цяпер прадстаўнік беларускага КГБ у ФСБ Расеі **Ю.Бародзіч** — фэдэрацыю хакею. Во, якіх атлетаў выхавала „вялікая Родзіна”.

■ Расейскія тавары выцясьняюць беларускія. Раней Беларусь была пастаўшчыкам харчаваньня і тавараў народнага спажываньня ў Маскву, Пецярбург ды іншыя расейскія цэнтры. А цяпер назіраецца адваротны працэс — гэтыя тавары рушылі з Расеі да нас. Гэта сьведчыць аб страшнай хваробе беларускай эканомікі, якая можа даканаць Бацькаўшчыну. У выніку наплыву танных (і нізкаякасных) тавараў з Расеі, застаюцца бяз працы тысячы рабочых беларускіх прадпрыемстваў, бо іхныя склады запаўняюцца ўласнымі вырабамі, якія не знаходзяць збыту. Напрыклад, у Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласьці выпуск хлеба мясцовым хлебзаводам паменшыўся на 30%. Прычынай гэтага стаў гандаль у вёсках расейскім хлебам прыватнымі асобамі, што прыязджаюць зь Вялікіх Лук і Невеля (якія цяпер на тэрыторыі Расеі). У іх больш танныя, запакаваныя ў цэлафан хлеб, мука, рыба.

■ Сотні гараджанаў у Віцебскай вобласьці перасяляюцца ў сельскую мясцовасьць у пошуках працы. Толькі летась такім чынам пераўладкаваліся 254 гарадзкія сем’і. Такое адсяленьне ратуе ад голаду, але не ад беднасьці. Праца на зямлі па-ранейшаму застаецца самай нізкааплочваемай. У студзені сёлета праца калгасьніка аплочвалася ў 2,6 разоў таньней за працу сярэднестатыстычнага работніка прамысловасьці, у 2,8 разоў за працу лекара і ў 4 разы — за працу работніка сістэмы крэдытаваньня і страхаваньня. А як вядома, апошнія атрымліваюць таксама мізэрныя заробкі.

■ У Летуве пачаўся судовы працэс над былым супрацоўнікам дзяржбясьпекі СССР Пятрасам Расланасам. Былы афіцэр абвінавачваецца ў масавых забойствах мірных жыхороў. Працэс завочны, бо абвінавачваемы жыве пад Масквой і не імкнецца вярнуцца на радзіму. 25 чэрвеня 1941 г. ён наладзіў і ажыцьцявіў забойства 76 мясцовых жыхароў у Райняйскім лесе Цяльшайскага раёну. Літувісцкія ўлады зьвярталіся да Расеі з просьбай аб выдачы забойцы, але атрымалі адмову. Дзе там, выдаваць герояў СС.

■ У сярэдзіне сакавіка з Вашынгтону тэрмінова ад’ехаў прэс-аташэ расейскай амбасады Уладзімер Фралоў. Амэрыканскія СМІ паведамляюць, што менавіта ён ажыцьцяўляў сувязь з Р.Хансанам (супрацоўнікам ФСБ, арыштаваным нядаўна ў ЗША і абвінавачаным ў продажы супэрсакрэтных матар’ялаў Маскве). Фралова тэрмінова адклікалі, каб ён ня быў выдалены як пэрсона нон грата. Цэнтральнае выведвальнае ўпраўленьне ЗША паведаміла, што колькасьць расейскіх дыпляматаў-шпіёнаў у Амэрыцы перавысіла паказчыкі часоў халоднай вайны. Таму цалкам верагодна, што адміністрацыя Буша санкцыянуе высылку з краіны ўсіх расейскіх дыпляматаў.

■ Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, у лютым сёлета сярэдні налічаны заробак рабочых і служачых павялічыўся на 2,7% і склаў 91,559 рублёў. Можна было б парадавацца. Толькі залежыць, як лічыць. Рост заробку аказаўся ніжэйшым за тэмпы лютаўскай інфляцыі (3,9%). Выходзіць, што рэальны заробак зьнізіўся.

■ З 20 сакавіка на 50% узрос кошт праезду ў цягніках прыгарадных зносінаў.

■ 27 сакавіка завяршыўся візіт у Беларусь дэлегацыі Парляманцкай асамблеі НАТО на чале з віцэ-сьпікерам **Маркусам Мекелем**. Дэлегацыя праводзіла маніторынг унутрыпалітычнай і эканамічнай сітуацыі ў краіне напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў. Парлямантары сустрэліся з лукашэнкавымі „палатнікамі”, хаця і падкрэсьлівалі, што яны гэты „парлямант не прызнаюць, паколькі выбары ў яго не былі дэмакратычнымі і свабоднымі”.

Вось так, не прызнаюць, але сустракаюцца... Усьлед за Элізабэт Шродтэр з Эўрасаюзу, і НАТО непрыкметна пераходзіць да збліжэньня з дыктатаравай „палаткай”.

■ Сьцены і платы ў Менску размаляваныя па-руску нейкімі юнымі барацьбітамі з новай арганізацыі „Зубр”. Дзіўная, здаецца, справа, што, пад той жа шапкай, ствараецца новы імпэрскі „рух”. Пра гэта расказаў у „Советской Белоруссии” памочнік „прэзыдэнта” Сяргей Посахаў. Аказваецца, „Зубром” назвалі „міжнароднае дэпутацкае згуртаваньне”, утворанае ў Кіеве. Абрэвіятура раскрываецца як „Задзіночаньне Украіны, Беларусі і Расеі”. Прайшла нават „навукова-практычная” канфэрэнцыя ў Акадэміі Навук у Кіеве (усё сур’ёзна!).

Прысутнічала больш за 300 таварышаў: з расейскай Думы, менскіх „палатак”, КПБ і адміністрацыі „прэзыдэнта”. Вельмі шырока — ад левых да „правых” сілаў — была прадстаўленая палітычная эліта Ўкраіны.

■ 24 красавіка ў Менску ва ўрачыстай абстаноўцы быў падпісаны ***Акт Незалежнасьці Беларусі***, прыняты 29 ліпеня 2000г. Ўсебеларускім Зьездам. Падпісалі Акт сустаршыні Зьезду ***Рыгор Барадулін***, ***Генадзь Бураўкін***, ***Радзім Гарэцкі*** і ***Анатоль Грыцкевіч***. Цяпер Акт будзе перададзены дзяржаўным установам і дыпляматычным місіям. Акт перакладзены на дзесяць моваў.

■ **В**.**Вячорка** і **А**.**Лябедзька** апублікавалі ў „незалежнай” прэсе яркі, ярчэй не бывае, акт палітынага самараскрыцьця пад назвай „Спальваньне расейскага сьцяга — правакацыя”. Асабліва актыўна апраўдваўся перад расейскімі таварышчамі В.Вячорка: „Узначальваемая мной арганізацыя ня мае да гэтага ніякага дачыненьня... падобныя эпізоды цяжка прадухіліць. Пра гэта павінны задумацца расейскія палітыкі”.

■ Паводле дадзеных зь Міністэрства статыстыкі і аналізу, у студзені-лютым аб’ём вытворчасьці ў Беларусі павялічыўся толькі на 0,6% у параўнаньні з аналягічным леташнім пэрыядам. А летась гэты рост склаў 7%. Прычына гэтага відавочная: развальваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Знос асноўных фондаў у прамысловасьці дасягнуў 72%. Штогод ён павялічваецца на 4%. Калі такі тэмп захаваецца, то праз 6 год матэрыяльна-тэхнічная база будзе зьведзеная да нуля. У сельскай гаспадарцы сітуацыя з вытворчай базай яшчэ горшая. Маецца толькі 70% прадукцыйнай жывёлы. Колькасьць тэхнікі стала менш на 30-40% за часы Лукашэнкі. У няспраўным стане з пачаткам вясновай сяўбы знаходзіцца больш як трэцяя яе частка.

■ Бярозаўскі райвыканкам на Берасьцейшчыне забараніў групе грамадзянаў правесьці 1 красавіка пікет у падтрымку палітычнага курсу Лукашэнкі. Як паведаміў жыхар Бярозы *Сяргей Русецкі*, да пікету рыхтаваліся плякаты з надпісамі: „Лукашэнка — лепшы ў сьвеце прэзыдэнт. Дзякуючы падпісанай ім дамове з Расеяй у нас павялічыліся заробкі ды зьнізіліся кошты на харчаваньне і лекі”.

■ Сёлета працягваецца зьнішчэньне рэнтабельнасьці вытворчасьці на прадпрыемствах Магілёўшчыны. Паводле зьвестак абласнога ўпраўленьня статыстыкі, у лютым 2001 г. 53% прадпрыемстваў рэгіёна былі стратнымі (у лютым 2000г. — 50,7%). Рэнтабельнасьць прадукцыі зьнізілася з 2,3% ў студзені 2000 г. і да 0,7% — ў студзені 2001 г. Зьніжэньне рэнтабельнасьці суправаджаецца зьмяншэньнем аб’ёму прамысловай вытворчасьці.

■ На 1 сакавіка запасы гатовай прадукцыі на складах беларускіх прадпрыемстваў складалі 55,1% да сярэднемесячнага аб’ёму вытворчасьці прадукцыі і ацэньваліся ў 546,3 мільярды рублёў. Для параўнаньня: на 1 сакавіка 2000 г. запасы складалі 51,3%. Больш за ўсё склады затаваранкы крупамі (376,7% ад сярэднямесячнага аб’ёму вытворчасьці прадукцыі), шарсьцянымі тканінамі (293,8%), трактарамі (249%), абуткам (168,1%), матацыкламі (129%), халадзільнікамі (117,7%).

■ У сувязі з 5-гадовым юбілеем „саюзу” РФ і Беларусі Пуцін у Маскве ўзнагародзіў Лукашэнку ордэнам „За заслуги перед Отечеством” 2-й ступені. Лукашэнка радасна дзячыў шчодрага гаспадара, прызнаўшыся, што гэта ягоная першая дзяржаўная ўзнагарода. Выступаючы ў Крамлі, Лукашэнка сказаў, што расейцы і беларусы жывуць цяпер аднолькава. (Вось сапраўды шчасьце прываліла!)

■ На сваёй сэсіі лукашэнкава „палата” сфармавала дэлегацыі, якія будуць прадстаўляць яе (і нас) у міжнародных інстытуцыях. Бліскучы дыплямат генэрал **Мікалай Чаргінец** (услаўлены на ірана-іракскім напрамку зносінаў) узначаліў дэлегацыю па кантактах з Эўрапарлямантам, а таксама дэлегацыю з Парляманцкай асамблеяй НАТО.

■ Прадстаўнікі Эўрасаюзу і ЗША ў камісіі ААН па правах чалавека выступілі 30 сакавіка з крытыкай стану правоў чалавека ў шэрагу краінаў, у тым ліку ў Беларусі. „Адсутнасьць павагі да грамадзянскіх і палітычных правоў у Беларусі выклікае заклапочанасьць”, — заявіў ад імя Эўрасаюзу ***Ёхан Моландэр,*** кіраўнік дэлегацыі Швэцыі. Ён заклікаў улады Беларусі ня ўмешвацца ў судовыя працэсы, тэрмінова ажыцьцявіць заканадаўчыя рэформы для ўзмацненьня грамадзянскіх і палітычных правоў і забясьпечыць правядзеньне сёлета свабодных і справядлівых прэзыдэнцкіх выбараў.

***Валеры БУЙВАЛ***

# ПРА СУТНАСЬЦЬ РАСЕЙСКАГА ГРАМАДЗТВА

У Расеі ёсьць сацыёляг доктар навук Барыс Грушын. Нядаўна ён надрукаваў тры тамы сваіх дасьледваньняў і артыкулаў. Грушын імкнецца будаваць свае меркаваньні, не зважаючы на палітычныя прыхільнасьці. Гэта справа няпростая для расейца. Тым ня менш нельга адмовіць аўтару ў імкненьні быць аб’ектыўным.

Традыцыйна ён лічыць, што сістэма сацыялізму ў Расеі трымалася ня толькі на КГБ і агітпрапе, але і на волі, і на інтарэсах народу. У адпаведнасьці са словамі камуністычнага гімну, хто быў нічым, той стаў усім (ці хоць бы нечым).

Адначасна Грушын стараецца цьвяроза глядзець на рэчы і ня можа не бачыць „халопскай мэнтальнасьці” расейскага грамадзтва. Рэвалюцыю 1917 года ён ня лічыць (як большасьць расейскіх пішучых і гаворачых асобаў) парушэньнем натуральнага ходу расейскай гісторыі, а абсалютна нармальным яе прадаўжэньнем. Семдзесят гадоў сацыялізму — гэта працяг традыцыяў расейскага жыцьця.

Сёньняшні стан расейскага грамадзтва, зь яго пункту гледжаньня, нязвыклы. Б.Грушын думае, што „сёньня як раз робіцца яшчэ адна гістарычная спроба расейцаў зьмяніць ня толькі сваё адзеньне, але і душу, перайсьці ад векавога халопскага стану да стану свабоднай асобы”.

Невядома, чаму так мяркуе спадар Грушын, у той час калі расейская рэальнасьць пацьвярджае толькі працяг выробленага халопства на іншым узроўні і ў іншых абставінах. Урэшце сацыёляг і сам прыходзіць да такой высновы, калі піша, што моладзь расейская шмат у чым, як і раней, прасякнутая халопскім усьведамленьнем усёдазволенасьці і беспакаранасьці. *Жаданьне волі без закону — старая расейская традыцыя, якая несумяшчальная са свабодай асобы.*

Свабода асобы, як вядома, гэта не ўсёдазволенасьць, а магчымасьць рэалізаваць волю ў рамках закону і з апорай на закон. Галоўнае, чаго ў Расеі няма, — закону.

Б.Грушын дае такое вызначэньне мэнтальнай сітуацыі ў Расеі:

***„Грамадзтва як было крымінальным, так і засталося, на ўсіх узроўнях. Крымінальным ня ў сэнсе дэманстратыўных адкрытых злачынстваў, а ў сэнсе татальнай гатовасьці да дзеяньняў насуперак законам. Парушыць закон можа кожны, „уключаючы прэзыдэнта. І гэта — бяда.”***

***П.ЗЯНЮК*** *(паводле друку)*

# STATEMENT

## *On repressions and use of the brutal force by the Lukashenka regime against members of the Belarusan Liberation Movement*

On May 18, 2001 the Lukashenka regime has carried out a bandit action against the members *of the Conservative Christian Party — Belarusan Popular Front*.

This day at 9 a.m. group of civil clothed persons has executed the order of the minister of internal affairs general **Navumau** (he was presented on the square) and has used methods of the military hand-to-hand fighting against the citizens which picketed on the Centralnaua Square in Minsk in defense of the constitutional status of the independent Republic of Belarus.

***Mr. Uladzimer Yukho***, 55 years old, member of the Party, has suffered heavy injuries as result of the regime's bandit action. Bandits have purposefully used against him the special brutal methods and have broken his hand and ribs and hurt his breast. Mr. Yukho is in a bad condition in the hospital.

***Mr. Mikola Antsypovich***, deputy chairman *of the Conservative Christian Party — BPF,* has been seriously injured by the regime's bandits.

More than ***40 persons*** hsve been arrested as result of the punitive action in the center of Minsk.

* * *

The pro-Moscow regime's actions on May 18 and in generally in 2001 confirm that the regime didn't change its policy of force and is continuing to strengthen the colonial dependence of Belarus from the Russian empire.

The regime is brutally suppressing namely the main organizations *of the Belarusan National Liberation Movement*, which are acting with the scope to consolidate the Belarusan society, to defend the independence of Belarus, to resist against the impudent actions of the political, economical and secret structures of imperial Moscow. Moscow is trying to annihilate the Belarusan state and the Belarusan nation, to seize the Belarusan property.

Repressions became more active after February 18, 2001, when *the Conference of the Conservative Christian Party — BPF* and *of the Belarusan Popular Front* has adopted the decision to nominate ***Mr. Zianon Pazniak*** the candidate on the future presidential elections.

The regime is dealing the main blow to *the Conservative Christian Party — BPF* and *the Belarusan Popular Front „Adradzennie".* Leaders of the Party and *the Front* have been exposed to repressions in 2001. On April 4 ***Mr. Yuri Belenki***, acting chairman in Belarus, has been arrested and imprisoned in 15 days because he has participated in the manifestation on Freedom Day (March 25). ***Mr. Uladzimer Starchanka***, deputy chairman, has been sentenced to the fine of 35 minimal salaries because he has organized the action of Freedom Day in Homel.

***Mr. Mikola Antsypovich***, deputy chairman, has been arrested and injured on May 18 during the action in defense of Belarusan state and Constitution.

***Mr. Siarhei Papkou***, deputy chairman, has been brutally arrested in his apartment without the procurator's sanction, injured and tried because he had participated in the action *„Way of Chernobyl" on April 26.*

Members of Soim and Uprava of the Party ***Mrs. Sviatlana Belskaya***, ***Volha Katsiankova***, ***Valiantsina Maroz***, ***Tatsiana Tsiatserkina***, ***Mr. Mikola Savitski***, ***Uladzimer Ramantsou***, ***Anatol Lahutau***, ***Uladzimer Pleshchanka***, ***Uladzimer Yukho***, ***Ihar Loban*** have been exposed to repressions by the police and courts because they participated in the protest actions, distributed the information and collected the signatures.

The regime is trying to suppress the information about the activity of the Party and the Front. ***Mr. Anatol Kryvarot***, executive secretary, has been summoned to the police on May 14. The police tried to obtain the information about his personal correspondence. The customs in Brest have confiscated on April 2 **745** copies of the magazine *„Belaruskiya Vedamastsi"* (published by Mr. Zianon Pazniak in Poland) to ***Mr. Ales Chakholski***, sekretary of the Uprava of the Party. He has been sentenced to the fine of 50 minimal salaries. This year of the Party's activists have been arrested, fined, exposed to repressions because they distributed the information and collected the signatures in defense of the independence of Belarus.




***На дэманстрацыі.***

* * *

Because of the activity *of the Belarusan National Liberation Movement* and its organizations Moscow cannot transform the conflict between the Russian imperial circles and Belarusan patriotic forces into the directed conflict between Lukashenka and the nomenclature and colonial opposition.

We protest against all the attempts of the Russian diplomacy and of some of European countries to legitimize the pro-Moscow regime in Belarus. It is obvious that the democratic freedoms cannot exist under the anti-Belarusan regime.

We are worried because of the position of some western countries, which „don't notice" the occupation policy of Moscow and the imperial ambitions of Russia. It is very dangerous for the Central and East European countries.

We hope that the democratic western countries will take a decisive position with regard to the imperial actions of Moscow and to the anti-Belarusan, pro-Moscow regime. It is possible to stabilize the situation in Eastern Europe only strengthening independent and democratic Belarus.

Organizations *of the Belarusan National Liberation Movement* will take part actively in the electoral campaign in 2001 and defend independent and democratic Belarus in spite of the repressions of the regime.

***Leadership of the Belarusan Popular Front „Adradzennie"***
***and of the Conservative Christian Party — BPF***
*(Пераклад зь беларускай мовы В.Буйвала)*

*May 23, 2001*

Беларускія Ведамасьці
Беларускае выданьне
У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**